

25 Сакавіка ў Беластоку ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

АСВОЙВАННЕ КАМП'ЮТЭРА ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 13 (2498) Год XLIX | Беласток, 28 сакавіка 2004 г. | Цана 2,00 зл.

МЫ ВЫЙДЗЕМ ШЧЫЛЬНЫМІ РАДАМІ

Мы выйдзем шчыльнымі радамі,
На вольны, родны, свой прастор,
Хай воля вечна будзе з намі,
А гвалту мы дамо адпор.

Няхай жыве магутны, смелы,
Наш беларускі, родны дух,
Штандар наш бел-чырвона-белы,
Пакрыў сабой народны рух.

Браты, да шчасця мы падходзім,
Хай гром грыміць яшчэ мацней,
Ў крывавых муках мы адродзім,
Жыццё рэспублікі сваёй.

Фота АЛЬЖБЕТЫ СЕБЯТЫНСКАЙ

Ушануйма памяць Макара Краўцова!

Макар Краўцоў, аўтар гімна БНР — замучаны НКВД у Беластоку

Лёс Макара Краўцова — яскравае адлюстраванне лёсу цэлага пакалення беларусаў, якія на пачатку XX стагоддзя былі пакліканы „людзьмі звацца".

Нарадзіўся Макар Краўцоў (сапраўднае прозвішча Касцевіч) 18 жніўня 1891 года ў маленькай вёсачцы Баброўня, што паблізу мястэчка Скідаль на Гродзеншчыне. Псеўданім паэта ўзнік не выпадкова. Краўцовымі аднавяскоўцы называлі ягоных бацькоў, бо некалі прадзед шыў кажухі. Макар скончыў царкоўна-прыхадскую школу ў Галавачах, пасля вучыўся ў Свіслацкай настаўніцкай семінарыі. Пасля яе працаваў настаўнікам на Гродзеншчыне. У 1915 годзе быў забраны ў войска расійскай імперыі. Там узначальваў салдацкі камітэт 44-га вайсковага фронту, ад яго быў абраны на Усебеларускі з'езд 1917 года — пярэдадзень БНР. Ужо тады выразна выяўляецца ягоная грамадзянская пазіцыя. Акрамя палітычнай дзейнасці Краўцоў працуе ў асветніцкім кірунку. Цягам 1917-1919 гадоў ён укладае „Беларускі лемантар". На жаль, падрыхтаваная да друку кніжка так і не выйшла ў свет. З 1918 года Макар Краўцоў у Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Пасля ўтварэння Міністэрства беларускіх спраў у Літоўскім урадзе ў 1919 г. стварэў беларускія органы ўлады на Сакольшчыне. Са снежня 1919 года ўваходзіў у склад так званай Беларускай вайсковай камісіі.

Першыя спробы літаратурнага пяра Краўцоў пачаў у 1918 годзе. Знакаміты цяпер ваярскі гімн „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" быў надрукаваны як верш 30 кастрычніка 1919 года ў газеце „Беларусь". Пазней кампазітар Уладзімір Тэраўскі напіша да гэтых слоў музыку. Ваярскі марш стане гімнам Беларускай Народнай Рэспублікі і паўстанцаў Булак-Балаховіча.

Макар Краўцоў браў чынны ўдзел у Слуцкім паўстанні, якое распачалося ў лістападзе 1920 года. Ён быў прызначаны загадчыкам друкарні паўстанцаў у Клецку. Краўцоў верыў у поспех збройнага чыну. У лісце да іншага сябра Беларускай вайсковай камісіі капітана Францішка Кушаля ён пісаў: „Патрэбен толькі добры кірунак і скарыстанне з настрою народу. Іначай быць і не можа. Хвалі народныя могуць перакаціцца праз галовы правадыроў". Пазней, у верасні 1921 г. Краўцоў быў дэлегатам Першай Усебеларускай палітычнай канферэнцыі ў Празе. Пасля паразы Слуцкага паўстання паэт не вярнуўся ў родныя мясціны. З 1921 года ён жыў у Вільні, туды ж да яго прыехала жонка Ганна. Краўцоў настаўнічаў, вёў грамадска-літаратурную дзейнасць, рабіў пераклады класічных літаратурных твораў. У красавіку 1923 года выдаў часопіс „Саха", які быў адразу ж забаронены. Макар Краўцоў вёў ліставанне са сваякамі на малой радзіме, асабліва прыязныя адносіны былі ў яго з пляменнікам Платонам Касцевічам. 94-гадовы Апанас Цыхун, які летась у Гродне выдаў кніжку „Пройдзеныя шляхі-пуцявіны", даследаваў лёс Макара Краўцова. Ён піша, што з лістоў паэта вынікае, што той жыў у скрайняй беднасці, часта прасіў пляменніка пра грашовую падтрымку. Часам рупліўца беларушчыны апаноўваў адчай: „На жаль, нічога я цяпер не пішу. Няма куды. Душная атмасфера дый годзі. Прыйдзецца мусі пераключыцца на іншую мову ды шрайбаваць артыкулы ў расейскія або польскія штодзённікі". Паэт і ягоная жонка часта хварэлі. Мажліва галоўнай прычынай было гнятлівае нацыянальна-грамадскае становішча беларусаў.

У 1926 г. Макар Краўцоў быў арыштаваны польскімі ўладамі, пасля гэтага знявольваўся яшчэ колькі разоў. Пасля прыходу саветаў стала яшчэ горш. Лёс беларусаў таго гістарычнага перыяду — гэта лёс сапраўдных пакутнікаў. З кастрычніка 1939 года Краўцоў пачаў працаваць у газеце „Віленская праўда", але неўзабаве быў арыштаваны разам з іншымі беларускімі дзеячамі. Спецслужбы перавезлі Краўцова ў Беласток, дзе ён быў закатаваны ў засценках НКВД. Мяркуецца, што здарылася гэта ў снежні 1939 года. Падрабязнасці пра апошнія дні таленавітага паэта і пра месца ягонага пахавання пакуль не выяўленыя. Колькі іх, стваральнікаў БНР палегла за тое, „каб воля была вечна з намі"...

Уладзімір Хільмановіч

Годнасць і незалежнасць ☞ 2

Яўген Міранові́ч

У пачатку дзевяностых гадоў здарыўся цуд. Беларусь стала незалежнай краінай. Здзейснілася ідэя 25 Сакавіка. Усё адбылося без ахвяраў, нянавісці і гвалту. Нават апалячаныя беластоцкія беларусы пачалі заяўляць, што „пра свае справы хочам гаварыць самі"...

Краіна, да якой... ☞ 2

Віктар Сазонаў

Беларуская нацыянальная ідэя перажыла ў XX стагоддзі шмат выпрабаванняў. Яе спрабавалі знішчыць, маніпуляваць і спекуляваць ёй. Ад гэтага яна толькі больш узмацнілася, а яе носьбіты набылі досвед...

(Не)свабодныя зоны ☞ 4

Мацей Халадоўскі

Найважнейшы — доступ да расійскага рынку, значыць, магчымасць бязмытнага імпарту сыравіны і бязмытнага экспарту беларускіх вырабаў у Расію. Несумненна, добра разумее гэта адзін з найбольшых падляшскіх прадпрымальнікаў Сяргей Мартынюк — шэф фірмы „Пронар" з Нарвы. Неахвотна, аднак, рассакрэчвае гандлёвыя таямніцы свайго інвеставання ў СЭЗ...

Высакаякасныя вырабы ☞ 5

Аляксандр Вярбіцкі

Аляксандр Бандарук: — Сетка продажу нашых вырабаў ахоплівае звыш ста дылераў, галоўным чынам у Падляшскім і Мазавецкім ваяводствах. У Варшаву і яе найбліжэйшае наваколле паступае каля 70% нашай вытворчасці. На Беласточчыну ідзе мала...

Канцэрт... ☞ 10

Татка Стэп

Новая афарбоўка анімацыйнага асвятлення, як заўсёды моцны вакал Юркі Асенніка, ды ўсё мацней псіхадэлічныя апрацоўкі вядомых гітоў гурту ўвялі публіку ў даволі моцны транс. „Zero-85" пачало канцэрт песняй „Страчаная Ітака". Ці сапраўды страчаная? Хто быў на канцэрце, той напэўна думае інакш...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Савецкі Саюз ужо разваліўся, але на алімпіядзе ў сталіцы Каталоніі выступала дружына Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У яе складзе і прыехалі беларусы на Пірэнейскую паўвыспу. Поўным і галоўным трыумфатарам гэтых гульняў стаў беларускі гімнаст Віталь Шчэрба. 6 залатых медалёў ва ўсіх гімнастычных намінацыях — такога свет яшчэ не бачыў..!

Годнасць і незалежнасць

Не можна захаваць годнасці, не маючы незалежнасці; не можна быць незалежным, не маючы годнасці. Аб гэтым ведаюць усе народы сярэдняй і ўсходняй Еўропы, якія ў XX стагоддзі змагаліся за права на існаванне на сваёй зямлі. Таксама думала беларуская інтэлігенцыя напрыканцы XIX стагоддзя, якая, як найбольш прыніжальны факт, адчувала расійска-польскае змаганне за беларускія землі. Ніводзін з вялікіх суседніх народаў не звяртаў увагі на карэннае насельніцтва гэтай зямлі — беларусаў, успрымаючы іх як частку геаграфічнага асяроддзя.

Калі 25 сакавіка 1918 года пасля працяглых сварак і дыскусій прадстаўнікі беларускай нацыі аб'явілі волю будаваць сваю дзяржаву, нават свае ўспрынялі гэта як парушэнне святога права Расіі на панаванне над гэтай зямлёю. Няволя стала нормай штодзённага жыцця, свабода явілася дарогай у невядомую будучыню. Аднак сотні тысяч беларусаў у нейкай форме адзначылі тады свой удзел у змаганні за сваю дзяржаву. Гэтага факту не маглі ўжо праігнараваць кіруючыя Расіяй бальшавікі, якія, падзяліўшы з палякамі краіну папалам, у сваёй зоне ўплываў стварылі савецкую беларускую дзяржаву. Палякі, пад панаваннем якіх апынулася Заходняя Беларусь, вырашылі беларускае насельніцтва хутка пераўтварыць у патрыятычныя польскія масы. Па адзін і другі бок польска-савецкай мяжы праводзіліся эксперыменты, якія вялі да фізічнага і маральнага знішчэння элітаў. Кожная чужая ўлада заўсёды імкнецца маргіналізаваць тых, якія маглі б падняць за сабой народ.

У міжваенны перыяд адсутнасць незалежнасці асабліва адчувалі ўсе тыя, хто адмовіўся падтрымліваць антыбеларускую палітыку чужых рэжымаў. На ўсходзе вызначылі для іх шляхі ў Сібір і Курапаты, на захадзе — у турмы і Картуз-Бярозу. Нават зверскі гітлераўскі рэжым явіўся некаторым надзеяй на выратаванне ад прыніжэння і здзекаў з боку „братніх" народаў. Таму ў час нямецкай акупацыі ў гарадах Беларусі бел-чырвона-белыя сцягі луналі побач з фашысцкімі арнаментамі, а настаўнікі вярталі маладому пакаленню памяць пра ідэю 25 Сакавіка.

Пасля вайны саветы пры дапамозе дзяржаўнай прапаганды і адукацыйнай сістэмы дзесяткі гадоў кампраметавалі кожную ідэю, якая асацыявалася з незалежнасцю Беларусі. Палітыкаў, вучоных, пісьменнікаў, паэтаў, якія змагаліся за гэтую ідэю, паказвалі як здраднікаў, калабарантаў, ворагаў народа. Тое, што чорнае — называлі белым, а тое, што белае — чорным. Так выхоўваліся тры пакаленні беларусаў. Ідэя незалежнасці Бацькаўшчыны ў сапраўднасці жыла толькі на эміграцыі, сярод палітычных уцекачоў.

У пачатку дзевяностых гадоў здарыўся цуд. Беларусь стала незалежнай краінай. Здзейснілася ідэя 25 Сакавіка. Усё адбылося без ахвяраў, нянавісці і гвалту. Нават апалячаныя беластоцкія беларусы пачалі заяўляць, што „пра свае справы хочам гаварыць самі". Беларускаму люду свабода аказалася, аднак, больш стамляючай, чым савецкая каляровая клетка з поўнай міскай акрашанай кашы штодзень. Ніхто не ведаў, што рабіць з незалежнасцю і дэмакратыяй. Раней пра ўсё думала і ўсё давала ўлада — працу, кватэру, адпачынак, адну праўду пра мінулае і сучаснасць. Калі адзін дырэктар саўгаса запрапанаваў вярнуцца ў каляровую клетку, большасць пакінула свабоду і права рашаць пра свой лёс.

Для амаль двух мільёнаў беларусаў незалежнасць і свабода сталі прыкметай іх чалавечнасці. Для гэтай часткі беларускага грамадства 25 Сакавіка — найважнейшае свята ў календары. У нас, на Беласточчыне, стала яно святам людзей беларускай нацыянальнасці — не рускіх, не тутэйшых і не праваслаўных палякаў, а выключна беларусаў. З апалячанымі братамі 7 студзеня святкуем Каляды і праз тыдзень вітаем Новы год, але 25 Сакавіка святкуем разам з беларусамі, якія пражываюць у Мінску, Гародні, Вільні, Лондане, Чыкага...

У гэты дзень у Мінску пакуль не адбываецца вайсковы парад, прэзідэнт Беларусі не віншуе народа з нагоды атрымання незалежнасці, а толькі пасылае сваю гвардыю супраць грамадзян, якія святкуюць на вуліцы. Гэта аднак значна лепш чым у савецкі час — цяпер нікога не пасылаюць у Сібір. Гэтая халодная краіна знаходзіцца цяпер у іншай дзяржаве. Усё ж, нешта з 1918 года памянялася...

Яўген Мірановіч

Краіна, да якой мы ідзем

Беларусы — народ, які мае шматвекавую гісторыю сваёй дзяржаўнасці. Беларусы хацелі быць вольнымі і плацілі за свабоду сваімі жыццямі. Таму ў нас мноства славутых датаў, якія мы шануем, і якія пацвярджаюць старадаўнасць нашай дзяржаўнасці, а таксама нашую прагу да незалежнасці. Але менавіта Дзень Волі, калі Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, маючы ўсе паўнамоцтвы, выканала волю Усебеларускага з'езда і абвясціла Беларусь незалежнай краінай, стаў сама вялікім і паважаным нацыянальным святам.

Гэты дзень святкуюць па ўсім свеце, дзе толькі ёсць беларусы. І зразумела чаму. На пачатку XX стагоддзя на еўрапейскай палітычнай прасторы склаліся такія абставіны, што народ, які змог тады адстаяць сваю дзяржаўнасць, здабываў яе назаўсёды. 25 сакавіка 1918 года, абвясціўшы трэцюю Устаўную грамату Рады БНР, наш народ паставіў апошнюю кропку ў пытанні, ці быць беларускай дзяржаве. Шматвекавая крывавая барацьба за адраджэнне сваёй незалежнасці прывяла да лагічнага выніку і зрэалізавала мары пакаленняў змагароў за волю. Стала канчаткова зразумела, што Беларусь будзе жыць вечна, пакуль на свеце будуць дзяржавы. Стала відавочным, што з волевыяўленнем беларускага народа цяпер трэба будзе лічыцца ўсім і заўсёды. І калі хтосьці акупуе нашыя землі, то гэта толькі часовая з'ява. Рана ці позна акупантам давядзецца іх пакінуць з ганьбай, бо факт утварэння БНР назаўсёды зняў пытанне, ці будзе Беларусь незалежнай заможнай краінай, якой будуць ганарыцца беларусы ўсяго свету. Засталося толькі адно пытанне: калі гэта будзе? А гэта залежыць толькі ад саміх беларусаў.

На жаль, не да ўсіх гэта дайшло адразу. Здаецца, толькі дурні маглі не ўцяміць, што беларусы будуць біцца за сваю краіну і ўрэшце перамогуць. Некаторыя вырашылі, што яны не дурні і ім гэта разумець неабавязкова. Бальшавікі, палякі, немцы, то дамаўляючыся паміж сабой, то паасобку, намагаліся падзерці Беларусь на кавалкі. І зноў палілася кроў. За што змагаліся акупанты, па сённяшні дзень не ведаюць нават іх нашчадкі. Затое мы ведаем, што нашы продкі біліся за сваю дзяржаву, за ідэалы БНР, і асвяцілі свае імёны славай.

Бальшавікі першыя зразумелі бесперспектыўнасць душэння беларускага нацыянальна-вызвольнага духу толькі сілай. Маючы большую частку сваёй тэрыторыі ў Азіі і адпаведна азіяцкі менталітэт, яны паспрабавалі падмануць беларусаў, і пайшлі на саступкі. 1 студзеня 1919 года ЦК Расійскай кампартыі змушаны быў абвясціць Беларускую Савецкую Рэспубліку. Гэты хітры крок не змог аслабіць важнасці рашэнняў, прынятых 25 сакавіка. Наадварот, ён толькі падкрэсліў іх веліч, паказаў, што больш не заўважаць беларусаў як народ немагчыма.

Нават немцы, цалкам заняўшы Беларусь падчас II сусветнай вайны, на гэты раз ужо не „блыталі" беларусаў з іншымі. Яны скарысталі вопыт бальшавікоў, стараліся трошачку сябраваць. Ім даводзілася лічыцца і з мясцовымі беларускімі адміністрацыямі, і дазваляць беларускія школы, і прызнаваць беларускую сімволіку.

А вось Польшча заплаціла дарагі кошт за тое, што праігнаравала абвяшчэнне БНР незалежнай і вольнай дзяржавай. Менавіта тыя, з кім яна 18 сакавіка 1921 года падпісала Рыжскую дамову аб падзеле беларускіх зямель, і здрадзілі палякам у 1939-м. Сама іранічнае ў гэтым, што СССР тлумачыў свае дзеянні неабходнасцю аб'яднання заходніх беларусаў з усходнімі і вызвалення тых ад нацыянальнага прыгнёту. Намаганні па знішчэнні беларускасці на „крэсах всходніх" вылезлі нішчыцелям бокам.

Беларуская нацыянальная ідэя перажыла ў XX стагоддзі шмат выпрабаванняў. Яе спрабавалі знішчыць, маніпуляваць і спекуляваць ёй. Ад гэтага яна толькі больш узмацнілася, а яе носьбіты набылі досвед. Беларускі адраджэнскі рух, аб'яднаны ідэаламі БНР і ўзначалены апазіцыяй БНФ у парламенце, прымусіў Вярхоўны Савет БССР 27 ліпеня 1990 года абвясціць Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце.

Толькі тады, калі беларусы самі возьмуцца за сваё дзяржаўнае будаванне, наша Бацькаўшчына стане ўзорам вартага і годнага жыцця. І так будзе. Будзе таму, што за гэта дорага заплачана. Заплачана крывёй і пакутамі лепшых сыноў і дачок беларускага народа. Таму што свята 25 Сакавіка па-ранейшаму ёсць для нас ідэалам, да якога мы імкнемся.

Віктар Сазонаў
(Гродна)

Адцвітанне кнігі

Першы раз. Шчыт вежы ратушы аздоблены сілуэтам аграмаднага насякомага, выразанага з бляхі; кажуць, мела гэта ўвекавечыць налёт саранчы. Калі быў той налёт? Пэўна, яшчэ да патопу.

Унутры ратушы гнездавала шмат устаноў; а ў гарадскую бібліятэку трэба было падымацца на першы паверх па шырокіх змрочных усходах. Пішу аб часе, калі па кніжку сягаў ты як па цудадзейны напой, каб пры яго дапамозе адсланіць тое што закрытае, тое, што ў цяні. Было гэта ў час, калі па кнігу сягалі тады, каб рушыць у падарожжа, як у глыб сябе, так і ў прасцяг космасу. Пішу аб адным, тым самым падарожжы, а адрозненне вынікае адно з навыкаў мовы, мовы калекай, людское.

Калі гэта было, калі, напрыклад, па „Злога" Леапольда Тырманда, чорны крымінал і бестселер, трэба было запісацца ў доўгую чаргу, а кніга трапляла ў рукі ненасытнага чытача заплямленая, з выдзертымі старонкамі, якую было амаль не расчытаць. Што давяло да таго, што адна група калегаў з ліцэя, быццам клан ведаў таемных, з пагардай адкінула забаўляльную літаратуру, а занялася г.зв. сур'ёзнай літаратурай? Якой навукі, якой прыгоды, якіх азарэнняў яна шукала? Вядома, на шляху трапляліся літаратурныя моды, такія як экзістэнцыялізм Сартра ці Камю, як вялікія амерыканцы Хемінгуэй ці Фолкнер, ібераамерыканцы Борхес, Картасар ці Маркес, вялікая руская проза XIX стагоддзя Талстога, Чэхава ці Дастаеўскага, паэзія сімвалістаў і французскіх сюррэалістаў. А да таго адкрыцці літаратур нямодных народаў, недаацэненых у мастацкіх сталіцах свету, ды ўсё ж каштоўных, як беларуская, чэшская ці югаслаўская.

Важныя былі незаменныя тыя пошукі каментарыяў да таго што прамінае, да таго, што надыходзіць, што здзяйсняецца, здавалася б, так блізка, што крануў бы рукою. А аднак тое ўсё — такое няўлоўнае, трывожліва зменнае.

Чарговая карціна. Вялікі блакіт неба, калі падарожнічаеш конным возам на ўсход, у вёску дзядоў, пясчаным гасцінцам, земляным, у летні поўдзень. Захапляла вось што: мінаеш руіну танка з апошняй вайны, што ржавее на абочыне; альбо апусцелы, абяздушаны млын над рэчкай. А на ўскраіне вёскі хлопец, што поіць каня ля студні з жоравам, альбо жанчына з іконай у далонях, што з'явілася на парозе хаціны накрытай страхою. Вёска, у якую не дабрыло дабрадзейства, а, можа, пракляцце электрыфікацыі, што азначала таксама дабрадзейства альбо пракляцце гарадской, агрэсіўнай цывілізацыі.

Хоць жывуць пасярод нас аматары ўяўной ідэальнай вясковай супольнасці-культуры, гарманічнай і незаплямленай чужымі, знішчальнымі ўплывамі. Тая супольнасць абыходзілася без пісанага слова. Калі б была такая цудоўная і прыгожая, як прапаведуецца, пэўна, захавалася б у нязменным выглядзе, засталася б.

Калі выходзіў ты са змроку з сеняў дома на падворак, адчуваў рытм, мелодыю, глыбіню цемры, цішыні; адчуваў дых ночы. Толькі зводдалі, з-за нябачнай ракі, даносіўся брэх адзінокага сабакі.

Як балела незразуменне, калі сядаў ты з кнігай на ганачку. Вось затрымаўся мужчына з сівай барадою, у доўгім, ледзь не да зямлі, кажусе. Заўзіраўся на чытаючага і кажа: „Смотрыт у кнігу і відзіт фігу".

Як балела незразуменне, калі казаў ты цётцы: „Глянь, як прыгожа ўсходзіць сонца над сасновым баром". І чуў: „А што нам ад тае прыгажосці, твая краса вынікае з незразумення цяжкай працы, праўдзівага труду. Трэба мне насыпаць есці курам, вось гэта дык і прыгожа!"

Сёння ведаю, якое літаратурнае было тое захапленне краявідам, вывучанае, перанесенае з мастацкіх твораў на прыроду.

Сёння, разам з абезлюдзеннем вёскі, адыходзіць у бяспамяць традыцыйная грамадскасць, раструшчваецца вясковая супольнасць.

Сёння таксама, ці ж не парадокс гэта, кніга прайгрывае сутычку з карцінкавай цывілізацыяй, тэлебачаннем, відэа і Інтэрнэтам, тымі дзецьмі цывілізацыі. Спадарожнічаюць гэтаму перамены жыцця-быту ў сусветным маштабе, якія выбіваюць зямныя грамадствы з каляін традыцыі. Мабыць таму кніга становіцца такой важнай, неабходнай як пункт апоры, перадышка ў віры рэвалюцыі, сведчанне часу і ўсведамленне нашага лёсу пад шалёным небам. Літаратура была б нейкім чынам спосабам самазахавання.

Ежы Плютовіч

25 Сакавіка стала ў нас нагодай дзеля сімвалічнай падзякі людзям, якія асабліва заслужыліся для нашай беларускай супольнасці ў Польшчы — у гэтым годзе букеты дарыліся Юрыю Васілюку, Міраславу Пякарскаму ды Яўгену Сачко...

Свята беларусаў

Упершыню, калі глянуць на гісторыю адкрытага святкавання Дня Незалежнасці Беларусі ў адноўленай Польшчы, абышлося яно ў Беластоку без персанальных запрашэнняў. Для беларускай эліты сёлетняе святкаванне стала як бы паўторным перапісам — прыйшоў на свята той, хто ўважаў, што беларусам у гэты момант трэба быць разам. Як і ранейшы перапіс насельніцтва, сакавіцкі перапіс нацыянальнасці атрымаўся вельмі паспяхова.

Беларускі саюз у Польшчы прымяркоўвае святкаванне Дня Незалежнасці да нядзелі — у гэтым годзе атрымалася гэта 21 сакавіка. Старшыня Саюза Яўген Вапа прывітаў гасцей са святам і надыходам вясны, якая, нібы па заказе, завітала ў Беласток у паўнаце сваёй красы акурат пад 25 Сакавіка. Дата гэтая, па словах прамоўцы, істотная падзея ў замацоўванні супольнасці беларускага народа. Народ 86 гадоў таму захацеў не толькі людзьмі звацца, але і запатрабаваў сваёй незалежнасці. Яўген Мірановіч, прафесар Універсітэта ў Беластоку, сказаў, што свята гэтае адзначаецца невялікім адсоткам грамадзян Рэспублікі Беларусь, але ўжо стваральнікі Беларускай Народнай Рэспублікі добра сабе ўсведамлялі, што заяўляючы пра незалежнасць краіны парушаюць яны „святое права" суседніх народаў на панаванне на беларускіх землях. Неўзабаве Беларусь сталі таптаць чужыя арміі, а пасля дзесяцігоддзямі народу сціралі памяць пра БНР. Пра дату памятала жменька эмігрантаў. Дваццаць гадоў таму, успомніў Я. Мірановіч, гадавіну 25 Сакавіка ў беластоцкім інтэрнаце святкавала 7 чалавек, а праз 10 гадоў у нашу краіну прыехаў амбасадар незалежнай Беларусі, у беластоцкай царкве была адслужана літургія за беларускі народ... І хаця, заключыў дакладчык, у 1994 г. уладу ў Беларусі ўзяў рэакцыйны рэжым, але павярнуць назад час яму не ўдалося. Святкаванне нават у сямейным ці сяброўскім крузе — гэта малыя фронты, якія вядуць да поўнай свабоды.

Віктар Сазонаў, які на беластоцкім святкаванні прадстаўляў дэмакратычныя сілы Беларусі, падзякаваў Беласточчыне за прыклад, якім яна была для беларусаў у савецкі час...

Віктар Сазонаў ад Фонду імя Льва Сапегі, які на беластоцкім святкаванні прадстаўляў дэмакратычныя сілы Беларусі, падзякаваў Беласточчыне за прыклад, якім яна была для беларусаў у савецкі час. Афіцыйную частку беластоцкага святкавання ўпрыгожыў выступ барда з Мінска Зміцера Сідаровіча. Ад некалькіх ужо гадоў 25 Сакавіка стала ў нас нагодай дзеля сімвалічнай падзякі людзям, якія на працягу мінулага года асабліва заслужыліся для нашай беларускай супольнасці ў Польшчы. У гэтым годзе старшыня Беларускага саюза ўручыў букеты перавязаныя бел-чырвона-белай стужкай войту Чыжоўскай гміны Юрыю Васілюку, беластоцкаму прадпрыемцу-менеджэру Міраславу Пякарскаму ды дырэктару Гайнаўскага беларускага ліцэя Яўгену Сачко. Годнае прадстаўніцтва Гайнаўкі на беластоцкім святкаванні і парадавала, і задзівіла... Амаль а той жа гадзіне ў самой Гайнаўцы адкрываўся агляд беларускага кіно. Аказваецца, калі ёсць воля і ахвота — можна ў двух месцах быць адначасова!

Непамерна шкадую, што такое выдатнае мерапрыемства, як прэзентацыя беларускага фільма, адбываецца толькі ў Гайнаўцы — разумею прытым гонар маіх сяброў-гайнавян за свой горад. Апошні раз давялося глядзець беларускі фільм па польскім тэлебачанні, калі ў Польшчу афіцыйны візіт нанёс старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч — будзе гэта ўжо дзесятак з лішкам гадоў. Тады беластоцкія СМІ — ва ўмовах дэмакратычнай ужо Польшчы — зафундавалі нам адкрыты намёк на нашу дзяржаўную нелаяльнасць, быццам складаем мы асобную і ў нейкім сэнсе „недарослую" катэгорыю грамадзян краіны, якіх толькі павучваць як жыць... З таго часу, у маім адчуванні, памянялася не так і шмат. У гэтым годзе горад Беласток зафундаваў нам пад 25 Сакавіка тыдзень французскамоўных народаў — Алжыр, Гаяна, Палінезія...

Тое, што з нацыянальным святам не вітае беларусаў беларускі прэзідэнт — можна неяк зразумець, усё ж будуе ён сваю папулярнасць на антыбеларускіх акцыях. Можна нават зразумець, чаму не павіншуюць беларусаў польскія ўлады — ёсць жа нейкая дзяржаўная палітыка ў дачыненні да Беларусі. Але вось, чаму словам не заікнуцца самаўрадавыя дзеячы, паслы, сенатары..., рукі і вусны якіх той жа палітыкай не завязаны — не так ужо і проста асэнсаваць. Няпроста таму, што ёсць у найбліжэйшым свеце прыклад Чэхіі, у якой віншаванні беларусам з нагоды нацыянальнага свята выходзяць ад галавы дзяржавы.

Святкуем на Беласточчыне як эмігранты — нельга адпрэчыць такое сцвярджэнне. Замала аднак самі заяўляем, што не эмігранты мы, а рэальны народ у сваім доме...

Віншую Вас, беларусы, з нацыянальным святам.

Аляксандр Максімюк

Спявае Зміцер Сідаровіч. Фота АЛЬЖБЕТЫ СЕБЯТЫНСКАЙ

Хто нас чытае

Яшчэ ніколі не здарылася мне сустрэць у Сямятычах чалавека, які купляў бы або ў публічным месцы пераглядаў „Ніву" або іншы часопіс адрасаваны нацыянальным меншасцям Падляшша. Я сам, калі куплю „Ніву" ў кіёску, нашу яе так, каб загаловак быў бачны, з надзеяй, што нехта ўступіць са мною ў размову. Безвынікова! Толькі ў царкве бачу, як людзі купляюць „Przegląd Prawosławny" — там быццам бы не сорам.

Іншая справа, каб у Сямятычах пабачыць у гандлёвых пунктах „Ніву", трэба мець многа шчасця. Вырашыў я бліжэй прыгледзецца як наш тыднёвік распаўсюджваецца ў горадзе над Каменкай. З гэтай мэтай абышоў я ўсе газетныя кіёскі і найбольш папулярныя ў горадзе магазіны, у якіх прадаюцца газеты і часопісы. Вобраз, які ўзнік у выніку майго доследу, атрымаўся вельмі сумны.

У Сямятычах працуюць тры кіёскі „Руху", з якіх у два пастаянна пастаўляецца „Ніва", але толькі ў адным з іх, на Замосці, прадаюцца 1-2 экземпляры (у тым ліку адзін купляю я сам), а ў кіёску на Рондзе толькі ў турыстычным сезоне разыходзіцца крыху беларускіх газет. У названых кіёсках можна таксама купіць „Czasopis".

У васьмі вялікіх магазінах на паасобных пасёлках і ў цэнтры горада „Ніва" не прадаецца, а „Czasopis" даступны ў продажы толькі ў супермаркеце „Барт". Сітуацыю трохі выратоўвае Паштовае аддзяленне № 1, дзе кожны тыдзень прадаецца некалькі экземпляраў „Нівы". І гэта ўсё!

Вобраз жахлівы. Як гэта змяніць — не ведаю. Аднак сур'ёзна баюся за будучыню нацыянальнай тоеснасці нашых людзей. Хіба што свядома хочам стаць бязвольным статкам першапачаткова гэтак званых „праваслаўных палякаў", а з цягам часу — стопрацэнтнымі палякамі, ужо без гэтага „сарамлівага" прыметніка. Людзі — апамятайцеся!

М. Ц.

Ашуканцы

Нядаўна зайшоў да мяне ў хату малады прыгожы мужчына і спытаў ці я аплачваю абанемент за тэлевізар і радыё. Калі я пацвердзіў што плачу, тады ён мне сказаў, што войт Нарваўскай гміны тым сялянам, якія тэрмінова аплачваюць абанемент прызначыў 16 узнагарод у выглядзе: кухоннага міксера, збанка для гарбаты, электрычнага чайніка, апарата для памеру ціску крыві і падвойнага набору відэльцаў, нажоў і лыжак. Дастаткова селяніну заплаціць 250 зл., а ўзнагарода стане яго ўласнасцю.

Добра я ведаю, што войт Нарваўскай гміны — чалавек сур'ёзны, адказны, каб увайсці ў суполку з такімі ашуканцамі. Не мог я адразу патэлефанаваць войту (у нашай гміне якраз памянялі тэлефонныя нумары), каб паведаміць, што ашуканцы ездзяць па вёсках Нарваўскай гміны і падшываюцца пад войта.

Дарагія жыхары вёсак — не дайцеся абмануць!

Мікалай Лук'янюк

(Не)свабодныя зоны

Гродна — тут польскія фірмы любой цаною шукаюць партнёраў

— У апошні час польскі бок, перад уваходам у Еўрасаюз, усё больш зацікаўлены наладжаннем кантактаў з Беларуссю, — сцвердзіў генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Леанід Каравайка. — Ужо не гаворым толькі аб культурным, навуковым ці спартыўным, але перш за ўсё аб эканамічна-гандлёвым абмене.

Консул як прыклад дае адно з невялікіх падляшскіх прадпрыемстваў, якое выказала зацікаўленне вырабамі Гродзенскага камбіната будаўнічых матэрыялаў і намерваецца іх купляць. Адпаведнага партнёра не знайшло яно ў Мінску, а якраз у Гродне. Тут ад двух гадоў дзейнічае адна з шасці, у пастаянным развою, Свабодная эканамічная зона.

СЭЗ сталі ўзнікаць у Беларусі ў 1996 г. Інвеставанне там — вялікі шанц для прадпрымальнікаў, асабліва з Падляшша. Найважнейшае, што для прадпрыемстваў з замежным капіталам прадбачваюцца вялікі скідкі.

— За першыя пяць гадоў асобы, якія хочуць інвеставаць у Свабодную эканамічную зону, не плацяць падатку ад прыбытку, — тлумачыць генконсул Каравайка. — Гэта знакамітая развязка для супольных мерапрыемстваў.

Як у сваю чаргу сцвярджае Ірына Бугрова, эксперт Міжнароднага інстытута палітычных даследаванняў у Мінску, у беларускай палітыцы існаванне СЭЗ бывае адзіным сімвалам свабоднага рынку і атракцыйным паказчыкам „беларускага гаспадарчага цуду". Інвестараў прыцягваюць не толькі льготы ў шмат якіх падатках і іншыя скідкі. Найважнейшы — доступ да расійскага рынку, значыць, магчымасць бязмытнага імпарту сыравіны і бязмытнага экспарту беларускіх вырабаў у Расію. Несумненна, добра разумее гэта адзін з найбольшых падляшскіх прадпрымальнікаў Сяргей Мартынюк — шэф фірмы „Пронар" з Нарвы. Неахвотна, аднак, рассакрэчвае гандлёвыя таямніцы свайго інвеставання ў СЭЗ. Адно вядома, што ягоная фірма ў найбліжэйшыя месяцы возьме на працу да тысячы новых работнікаў. Ці частка з іх будзе працаваць у СЭЗ, невядома.

— А якая розніца, дзе яны працуюць — у Кракаве ці ва Уладзівастоку? — дадае таямніча прадпрымальнік.

Засакрэчаны беластоцкі бізнесмен, які гандлюе і прадукуе ў Беларусі ўжо адзінаццаць гадоў, кажа:

— Калі апынешся ўжо ў Беларусі са сваім капіталам, ловяць цябе ў незлічоную колькасць кантроляў, візітаў чыноўнікаў. Наша санепідэмстанцыя пры гэтым здаецца быць суперліберальнай установай. Перш за ўсё, найгоршае — неабходнасць пастаянных аплат розных подацяў, штрафаў. Кантралюецца ўсе тэлекамунікацыйныя бізнесавыя спалучэнні. І як тут гаварыць аб гандлёвай таямніцы!

І дадае:

— Значная праблема беларускай гаспадаркі — недахоп замежнай валюты, а СЭЗ дае магчымасць яе сцягнуць. Да таго гэтая сістэма — нярынкавая, а ўсё цэнтралізаваная, працуючая ўсё метадамі сацыялістычнага размеркавання.

Польскія бізнесоўцы наракаюць таксама на часта змяняючыеся юрыдычныя правілы, зацяжныя адміністрацыйна-рэгістрацыйныя працэдуры, неабходнасць хадайнічання за канцэсіямі, цяжкасці ў вылічанні ПДВ (VAT).

Паводле дадзеных, якімі распараджаецца Генконсульства ў Беластоку, беларускі экспарт у Польшчу гэта 21 груп тавараў з пастаўкамі больш за мільён долараў. Прытым яго падстава — восем груп (больш за 5 млн. дол.). Гэта перш за ўсё нафтапрадукты, агранічныя хімічныя матэрыялы, сродкі транспарту, запасныя часткі, машыны і абсталяванне, хімвалакно.

Цяпер у Беларусі вядзе сваю дзейнасць каля чатырох тысяч прадпрыемстваў з замежным капіталам з 83 краін свету. Больш за трыста гэта прадпрыемствы з польскім капіталам, а 43 зарэгістравала сваю дзейнасць у СЭЗ. Дзейнічае 26 прадстаўніцтваў польскіх суполак. Сярод найважнейшых рэзідэнтаў беларускіх СЭЗ — немцы (32,3%). Далей — брытанцы, чэхі, амерыканцы. Польскія рэзідэнты складаюць ледзь 5,8%.

Самая папулярная форма функцыянавання ў зонах — заснаванне супольнага прадпрыемства з беларускім партнёрам (joint venture) альбо інвестыцыя пры стопрацэнтным паі замежнай фірмы. Прытым мінімальны пай замежнага партнёра ў капітале прадпрыемства не можа быць меншы чым 20 тысяч долараў.

Ірына Бугрова заўважае:

— З пункту гледжання эканомікі краіны, СЭЗ не сталі маторам такім, як у гаспадарцы Кітая. Агульны ўклад СЭЗ у гаспадарку Беларусі не перасягае двух працэнтаў валавога прадукту краіны.

У Беларусі ўсё на хапае комплекснага развою СЭЗ у кожным з шасці рэгіёнаў. Гэта між іншым спрычыняецца да асцярожнасці замежных інвестараў.

Мацей Халадоўскі

Закалот вакол чыгункі

Зноў (як штогод) узнік закалот вакол чыгункі. Прадпрыемства пасажырскіх рэгіянальных перавозаў у Беластоку заявіла, што ад 1 красавіка адмяняецца рух цягнікоў на чыгуначнай лініі Чаромха — Беласток. Аб гэтым радных Чаромхаўскай гміны паведаміў войт на сесіі 10 сакавіка. Паводле слоў кіраўніка мясцовага самаўрада, не ўсё яшчэ страчана. Існуе магчымасць пахадайнічаць аб адмене рашэння.

— Трэба адно мабілізаваць сілы. Прафсаюзныя чыгуначныя, як і няўрадавыя грамадскія арганізацыі павінны адстойваць грамадскі інтарэс, — гаварыў войт, — бо хто стукае, таму адчыняюць.

Чаромхаўскія скептыкі журацца і іншым. Дагэтуль было невядома, што будзе з ільготнымі праездамі для чыгуначнікаў, пенсіянераў і іхніх сем'яў. Справа канчаткова вырашылася. Білетныя касы пачалі продаж марак на ільготныя праезды ў гэтым годзе. Для сям'і пенсіянера, як і дзейных працаўнікоў кошт маркі складае 53 зл. ад асобы і 5 зл. за падачу заявы, на цягнікі II класа.

— Калі б закрывалі лінію, дык не прадавалі б марак на гэты год, — канстатуюць чарамшане.

У Чаромсе арганізавалася таварыства „Прыязны транспарт" пад старшынствам Надзеі Сулімы, якое змагаецца за ўтрыманне лініі Чаромха — Беласток. У канцы мінулага года таварыства праводзіла збор подпісаў за вяртанне адмененых у палове снежня мінулага года двух цягнікоў. Сабрана было больш тысячы ста подпісаў. Маршалкоўская ўправа адказала таварыству, што ў гэтым годзе прадбачваецца рамонт лініі Чаромха — Беласток і павышэнне хуткасці рэйкавых аўтобусаў да 50 км/гадз.

І апошняя справа. У мінулым годзе на прамоцыі новага рэйкавага аўтобуса на чыгуначнай станцыі ў Чаромсе намеснік старшыні Маршалкоўскай управы Ян Камінскі абяцаў прысутным, што ад 1 чэрвеня 2004 года будуць такім аўтобусам падарожнічаць у Беласток. Ці, затым, стрымае слова? Час пакажа. Я — аптыміст і давяраю віцэ-маршалку. Веру таксама, што цягнікі на лініі Чаромха — Беласток будуць курсіраваць паводле нязмененага раскладу.

Уладзімір Сідарук

Нашы вырабы высакаякасныя

Размова са старшынёй суполкі „Будаўнічая кераміка Ляўкова" Аляксандрам БАНДАРУКОМ.

— ***Сутыкнуўся я з чуткамі, што штораз менш вашых вырабаў прадаецца на Падляшша, а галоўным прыёмшчыкам становіцца Варшава.***

— Сетка продажу нашых вырабаў ахоплівае звыш ста дылераў, галоўным чынам у Падляшскім і Мазавецкім ваяводствах. У Варшаву і яе найбліжэйшае наваколле паступае каля 70% нашай вытворчасці. На Беласточчыну ідзе мала, бо тут паяўляюцца іншыя тэхналогіі, якія базіруюць на не надта якасным матэрыяле.

У агульнасці, у Польшчы рэлятыўна мала будуецца і наш удзел у еўрасаюзным будаўніцтве складае толькі 2%.

У польскім будаўніцтве прымяняюцца праверaныя і неправераныя тэхналогіі. На Захадзе — у Бельгіі, Даніі, Германіі, Іспаніі, Шатландыі — дамы будуюць толькі з чырвонай цэглы. Цэгла з'яўляецца другім пасля драўніны будаўнічым матэрыялам: яна трывалая, характарызуецца выдатнымі тэрмаізаляцыйнымі і экалагічнымі якасцямі.

— ***Мабыць, яна ў нас задарагая, не па нашай кішэні.***

— Цэгла мусіць быць дарагая, бо працэс яе вытворчасці складаны і энергаёмісты, але гэта ў далейшым аплачваецца! Канструкцыя дома — сцены і гарызантальныя перакрыцці — паглынае толькі каля 7% усяго кошту пабудовы. Бываюць і такія кур'ёзы, калі ўласнік дома абзаводзіцца ваннай, якая ў дзесяцькрат даражэйшая ад муроў, ашчаджаючы менавіта на сценах, але гэта пасля адбіваецца на абаграванні.

— ***Даводзілася мне пачуць, што ў ляўкоўскім прадпрыемстве скарачаецца лік рабочых. Ці не прадвяшчае гэта згортвання вашага прадпрыемства?***

— Лік персаналу скараціўся і сёння ў нас, улічваючы падрадчыкаў, працуе каля ста шасцідзесяці чалавек, аднак аб'ём вытворчасці не паменшаў, бо ўводзім тэхнічны прагрэс. Да 90-х гадоў дзяржава даплачвала да вытворчасці, а сёння працуем за свой кошт. Цэны будаўнічых матэрыялаў усё меншаюць і меншаюць. Ляўкова, аднак, трымаецца і хто хоча ў нас працаваць, той працуе. Нікога мы не ўвольнілі, а тым, якія хацелі адысці, мы спрыялі. Наша прадпрыемства з'яўляецца візіткай гміны, павета і ваяводства, дзе мы з'яўляемся найбольшым вытворцам будматэрыялаў. У нас сфарміраваўся зладжаны і дасведчаны працоўны калектыў, а прадпрыемствам — ад яго заснавання 36 гадоў таму — кіруюць мясцовыя людзі. У трох печах і сушыльнях выпускаем каля сарака мільёнаў адзінак тавару ў год. Залежаў сыравіны для нашай вытворчасці хопіць на пяцьдзесят гадоў. Нашы вырабы высакаякасныя, вядомыя ва ўсёй Польшчы. Маем сертыфікаты і атэстацыі бяспечнасці Інстытута будаўнічай тэхнікі. Для аднаўлення Супрасльскага манастыра патрэбны былі фармоўкі, якіх ніхто не наважваўся выканаць, а мы гэта зрабілі і яны ўжо занялі сваё месца ў манастырскіх мурах. Мы атрымалі шмат узнагарод на будаўнічых кірмашах, а за 2002 год — дыплом Fair Play Краёвай гаспадарчай палаты.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

І яшчэ адна цікавінка. У нас горназдабываючае прадпрыемства, якое падлягае пад шахтавы нагляд у Любліне; маем дзве капальні — гліны і пяску. Апошняя распаложана на балоцістых пашах, дзе калісь — як згадваў мой дзед — гразлі каровы. І вось на тым месцы нашымі работнікамі былі выкапаны — як устанавілі археолагі — рогі паўночнага аленя і косці ног насарога дзесяцітысячагадовай даўнасці; яны перададзены Акруговаму музею ў Беластоку.

— ***З 1 мая г.г. на 15% узрастае ПДВ на будматэрыялы. Ці не спадзяецеся цяжкасцей з продажам вашых вырабаў?***

— Пра падатак на даданую вартасць (VAT) гаварыць зарана, бо заканадаўчы працэс яшчэ не завяршыўся. Далучэнне да Еўрасаюза абцяжарвае прадпрыемствы новымі задачамі і перспектывы росту будаўніцтва цьмяныя; не надта вядома, што будзе пасля 1 мая.

— ***Але пакуль да гэтай даты, дык хіба нейкае ажыўленне ёсць?***

— У студзені і лютым г.г. аб'ём продажу нашай вытворчасці быў удвая большы чым у тых жа месяцах за апошнія пяць гадоў.

— ***Усё ж такі плошча вакол прадукцыйных цэхаў завалена цэглай...***

— Уся яна ўжо выкуплена.

— ***Ці не думаеце прапанаваць свае вырабы замежжу?***

— Цэгла цяжкая і кошт яе транспарту вялікі, таму Захад нам бесперспектыўны. Цікавімся беларускім рынкам, але там некарысны для нас цэнавы баланс.

— ***Дзякую за размову.***

Размаўляў Аляксандр Вярбіцкі

Крыж у Сямятычах

Штораз часцей у размовах з рознымі людзьмі выплывае пытанне звышнатуральнай з'явы, якую можна было наглядаць над Сямятычамі. Здарылася гэта напярэдадні Раждаства Хрыстовага, 6 студзеня 2004 г. На небе над чыгуначнай станцыяй Сямятычы, сем кіламетраў ад горада, паказаўся святлісты праваслаўны крыж чырвонага колеру. З'ява, выразна відочная на паўднёвым баку неба, была вялізных памераў. І хаця не трывала яна доўга, многа людзей паспела яе пабачыць. Цікавае тое, што крыж перш за ўсё бачылі каталікі, паколькі праваслаўныя ў гэтую пару спажывалі куццю за святочным сталом.

Скажа хтосьці: „Ат, выпадковая з'ява, палярнае ззянне, або нешта іншае..." Можа і выпадковасць, але ці выпадкова светляныя лініі размясціліся акурат так, каб атрымалася выява рэгулярнага праваслаўнага крыжа з перакладзінай? А чаму ніколі на небе не з'явілася чырвоная пяціканцовая зорка, або профіль Леніна? Калі выпадак, дык выпадак!

Бог не раз людзям, разгубленым у жыццёвай сумятні, дае розныя знакі, напамінае аб сабе. Так зусім нядаўна было ў Белавежы, дзе на дубе, на месцы адрэзанай галіны, з'явілася ікона. Менавіта ікона, а не партрэт, напрыклад, войта гміны. Таксама выпадковасць?

Трэба нам навучыцца мець адкрытыя вочы і рабіць правільныя высновы з такіх знакаў. І выпраўлянне свету пачынайма ад сябе. Напэўна нічога на гэтым не страцім.

М. Ц.

Насіў воўк...

Да канца сакавіка г.г. паменшае лік ваўкоў на Падляшшы. Чаму? Ваўкі з 1998 года апынуліся пад аховай, але ў апошні час прычыняюць многа шкоды. У мінулым годзе на Падляшшы іх ахвярамі стала звыш 120 штук быдла — гэта амаль удвая больш чым у папярэдніх гадах. Ваяводскі рэстаўратар прыроды даў дабро на адстрэл трох ваўкоў.

Улетку смакавітай вячэрай ваўкоў, паднесенай пад сам нос, бываюць цяляты на старонніх пашах, часта захіленых лесам. Бывае так і ў заходняй частцы Арлянскай гміны. Сяляне могуць хадайнічаць за кампенсацыямі за загрызеную жывёлу. У мінулым годзе да падляшскага рэстаўратара прыроды трапіла 120 заявак на кампенсацыю. Віну ваўка сцвярджае ветэрынар, а расцэнку страты праводзіць эксперт.

Ваяводскі рэстаўратар мяркуе, што напуганыя адстрэлам драпежнікі перанясуцца ўглыб пушчы і свойскую жывёлу пакінуць у спакоі. Дазвол на адстрэл важны да канца сакавіка. На ваўкоў будзе паляваць некалькіх спецыяльна абучаных паляўнічых. Ваўка нельга забіць ні звычайнаму паляўнічаму, ні пакрыўджанаму селяніну, бо за гэта пагражаюць высокія кары. Бывае, аднак, што робяць гэта браканьеры.

Ваўкі пражываюць у вялікіх лясных масівах у цэнтральнай і ўсходняй Еўропе, а ў заходняй — невялікія асобныя папуляцыі. Мяркуецца, што ў Польшчы жыве іх 600-800 штук, найбольш на ўсходзе і поўдні. У Аўгустоўскай пушчы пражывае каля шасцідзесяці ваўкоў, у Белавежскай — каля дваццаці, і каля дзесяці ў Белавежскім паказным запаведніку.

Міхал Мінцэвіч

Вачыма паляка

Пернікаў не было

Зноў самаўрадавая Улада знайшла ідэю на прамоцыю рэгіёна. Толькі што аб'явіла конкурс на „выпрамаванне вырабаў, месц ці мерапрыемстваў (яны далей называюцца прадуктамі), якія з-за сваёй якасці, унікальных адметнасцей і сувязей з Падляшскім ваяводствам прадстаўляюць надзвычайны ўзровень, годны пераймання". У гэты раз Улада будзе ўзнагароджваць статуэткамі ў трох катэгорыях: смак года, месца года, ідэя года.

Быў я на прэс-канферэнцыі скліканай з гэтай нагоды. Тлумачэнне ідэі Улады працягвалася больш за паўгадзіны. І што, спытаецеся. Ну, і зноўку нічога. Будзе капітул, які будзе вылучаць, ну і тыя статуэткі, плюс граматы. Прычым, што надта цікава, тыя статуэткі маюць быць накталт кшталту Польшчы з мастацка далучаным дубовым лісцем, размешчаным так, быццам бы на карце наш рэгіён ляжаў „толькі" ад Монек, але „аж" па Эльбланг. Ужо толькі ад зласлівасці ўяўляю сабе, што, згодна з праектам тае статуэткі, сталіца рэгіёна — Сувалкі, горад, з якога родам падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі. На канферэнцыі зацікавіць меў сімвал дуба. Пан маршалак растлумачыў:

— У нас ёсць не толькі зубры і буслы, але і лясы прыгожыя, сярод іх — дубовыя.

А я сабе думаю, што і сасновыя бары ёсць у нас. А калі б праехацца хоць бы сабе па Белавежскай пушчы ці па нейкім ландшафтным парку, то знайшлося б яшчэ некалькі і іншых відаў дрэў. Аднак ва Улады няма часу валэндацца па пушчах ці парках. Улада для таго, каб сядзець ва ўстанове і выдумляць, як „выпрамаваць". Ну, вядома, не сябе самую, а рэгіён, бо, як казаў маршалак Кшыжэўскі:

— Гэты луг настолькі разлеглы, што на ім могуць расці розныя кветкі.

І далей гэтак тлумачыў:

— Такая прамацыйная акцыя — шанц праявіцца Падляшшу на рэгіянальнай карце Еўропы.

Мабыць, і праўда. Толькі што, як чуў я нядаўна, такога ваяводства як Падляшскае мае ўвогуле не быць на карце. Кажуць, ЕС хоча ў Польшчы сямі-васьмі рэгіёнаў. Тады лягчэй будзе дзяліць еўрасаюзныя дарункі. Міністр адказны за адміністрацыйны падзел краіны, значыць, цяпер Юзаф Алексы, пярэчыць. Ды нейкія чыноўнікі ў Бруселі ў „Польсаце" — пацвярджаюць.

Ну, вернемся да „дубовага" конкурсу. Заявы кандыдата маюць быць толькі віртуальныя, значыць, апынуцца ў портале Падляшскай маршалкоўскай установы „Вароты Падляшша". А там на гэтым лузе можа сабе кожны еўрапеец, амерыканец ці азіят гарцаваць уволю. Толькі ці ім захочацца там гойсаць, калі спалучэнне з „Варотамі" валочыцца інтэрнэтную эпоху, значыць, пасля хвіліны адсвечваецца інфармацыя „Старонку немагчыма адкрыць".

Дарагая мая Улада, з тугою чакаю чарговых Тваіх прамацыйных ідэй, ну і, вядома, прэс-канферэнцый, з якіх адно можна мець без сумненняў: пернічкі з кавай. Ну, зманіў. На прэс-канферэнцыі, прамуючай прамацыйную ідэю былі: смак, месца, ідэя. А пернічкаў — не было.

Мацей Халадоўскі

Ганна Кандрацюк
zorka@niva.iig.pl

зорка

для дзяцей і моладзі

Спяваем і дэкламуем — Беласток

Змагаемся ў турнірах — Бельск

Фатаграфуемся на добрую згадку — Гарадок

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Васіль Жуковіч

Ярыла

Ярыла прыедзе
на белым кані.
Давай пагукаем
яго ў цішыні.

Вясновачка ўвішна
каня прывядзе.
З каня ён саскочыць,
прыгожы, як дзень.

А з крэсівам кайстра
ў яго на плячы,
з сабой залатыя
нясе ён ключы.

Агнішча распаліць
на радасць вясне,
ключамі палеткі
усе
адамкне.

Дзе ён ні пагляне,
там колас устане,
дзе ступіць нагой,
там жыта капой.

(Ярыла — бог сонца і ўрадлівасці.)

Міра Лукша

Сакавік

Ацепліць сонца
Мёртвую глебу.
У наша аконца
Загляне неба.
У душы народа
Надзея ўстане,
Наша свабода
У новае ранне.
Наш сцяг лунае
У ветры вясновым.
Не забываем.
У шэрагу роўным
Прышласць вітаем.

Пад бел-чырвона-белым сцягам

Напярэдадні Свята Незалежнасці рэдакцыя „Зоркі" наведала сяброў з ПШ н-р 4 у Беластоку. У мінулым годзе, разам з настаўніцай беларускай мовы Алінай Ваўранюк і бацькамі, яны ўдзельнічалі ў святкаванні 25 Сакавіка.

***— Як ты праводзіш 25 Сакавіка?* — спыталі мы маладых беларусаў.**

Оля Максімюк: — Кожны год разам з бацькамі ўдзельнічаю ва ўрачыстым святкаванні Дня незалежнасці. Разам з беларусамі Беласточчыны мы глядзім слайды пра жыццё нашай грамадскасці, слухаем гістарычных дакладаў пра Беларусь.

Аня Яканюк: — Гэты дзень вельмі важны для Беларусі і беларусаў. Мы павінны пра яго больш ведаць і ўшаноўваць. Павінны ведаць таксама гісторыю самога свята.

Наталля Кандрацюк-Свярубская: — Люблю, калі ў Беластоку праводзяцца такія мерапрыемствы, у іх прымаюць удзел і дарослыя, і дзеткі. Люблю, калі спяваем мы „Пагоню", „Сцяг" або „Магутны Божа", тады ў глыбіні душы адчуваеш як важнае гэтае свята! Думаю, што ўсе беларусы павіны ведаць і святкаваць 25 Сакавіка.

Эмілька Мусько: — Усе ведаем пра 11 Лістапада, Свята незалежнасці Польшчы і яго святкуем. Давайце і ў Дзень Незалежнасці Беларусі, павесім бел-чырвона-белы сцяг, хай людзі ведаюць пра наша свята і Беларусь.

Оля Паўлючук: — Кожны год мы павінны святкаваць 25 Сакавіка, пазнаваць гісторыю Беларусі.

Магда Саковіч: — Трэба святкаваць. З Беларуссю звязаны мае карані, у школе я вывучаю беларускую мову і гісторыю Беларусі.

Алекс Мазурук: — Гэта патрыятычнае свята і яго трэба святкаваць. У іншых краінах святкуюць такія святы. Гэта важная справа. У Польшчы мала хто ведае, што 25 Сакавіка — гэта Свята Незалежнасці беларусаў. Мы павінны святкаваць гэтае свята, бо мы — беларусы.

Марыюш Врублеўскі: — Думаю, што ўсе павінны святкаваць 25 Сакавіка, бо гэта важнае свята.

Оля Каліна: — У гэты дзень дарослыя павінны нам зрабіць дыскатэку і задбаць, каб 25-га не было посту. Тады яно нам добра запамятаецца.

Мацек Карчэўскі: — Буду святкаваць 25 Сакавіка. Зраблю імпрэзу, уключу музыку, каб і суседзі пачулі, што сёння беларускае свята.

Аляксандр Ваўранюк: — Не бачу нічога дрэннага ў святкаванні 25 Сакавіка. Калі хто хоча святкаваць, хай святкуе. Калі святкуюць свае свята палякі — то чаму мы не можам святкаваць беларускіх? Беларусь не горшая. Хоць думаю, што народным святам павінна быць 18 сакавіка — бо гэта мой дзень нараджэння.

Аліна Ваўранюк (мама Аляксандра): — Я толькі дадам, што твой дзень нараджэння планаваўся менавіта на 25 сакавіка!

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Лявон Вольскі

Сонца нам дапаможа

Над нашай зямлёю — неба,
Над нашым небам — зямля,
На нашай зямлі трава і вада,
І дрэвы, і промні сьвятла.

Нас гэта зямля нарадзіла,
Яе малако мы пілі,
І ўсё, што ў жыцьці дае нам сілы,
Ёсьць на нашай зямлі.

Сонца нам дапаможа,
Сонца нам дапаможа,
Яно любіць нас.

Дарэмна канкістадоры
Сьпяваюць песьню вайны,
Заваяваць наша сонца і зоры
Ніколі ня змогуць яны.

Нас любіць калматае сонца,
Нас любіць месяц сівы,
І сонца, і месяц дадуць нам моцы
Для нашае барацьбы.

Сонца нам дапаможа...

Мінуць у тумане стагодзьдзі,
І сталь спарахнее ўшчэнт,
А мы тут былі, і мы тут будзем,
Пакуль існуе гэты сьвет.

Сонца нам дапаможа...

(песьня з альбома „Я нарадзіўся тут")

Адзін

... Адны кажуць, што добра быць адзіным дзіцём у сям'і. Усе на цябе ўвагу звяртаюць, глядзяць як на нейкі скарб найвялікшы — і бацькі, і цёткі, і бабулі з дзядамі... І дагаджаюць, і слухаюць цябе. І нічога не шкадуюць. А калі ты першы сярод братоў ды сясцёр — усім уступай, з усімі дзяліся. І ўвага да цябе меншая, бо ты — не адзін. А калі ты найменшы — хто цябе паслухае! Хто з малым лічыцца! А калі сярэдні — дык ужо невядома як: слухай старэйшага, дбай аб малодшага, падзяліся з усімі... А ў сям'і — як ува ўсім грамадстве. З усімі мусіць чалавек лічыцца, і справядліва ўсё ацаняць, і хоча да сябе ўвагі. Хто кіруе, хто выконвае. Адно, кажуць, малым адна справа — абы вучыліся. Час такі: расці, гадуйся ды вучыся, каб, як вырасцеш, ведаў, як жыць...

Сядзіць Паўлік, слухае, што цёця Ганя да яго гаворыць. А, можа, і сама так да сябе прамаўляе... З гэтай цёткай так заўсёды: завядзе размову быццам аб нічым, а пасля пытаецца, ці зразумеў. Сама толькі што кончыла ліцэй, а разумнічае.

— А ты сама яшчэ вучышся, але ўжо даўно не расцеш — адкуль памятаю, ты была на галаву меншая ад майго таты, — спыніў цётчыны разважанні Паўлік.

— Ды паміж намі з табою, Паўлік, розніца ўсё меншае. Значыць, расцеш ты, а я, можа... стоптваюся. Бачыў, якая прабабка Нюра маленькая. Ходзіць па свеце столькі часу, дык і схадзілася.

— От, жартуеш... Усе з мяне жартачкі робіце — і прабабка, і бабулі, і дзядулі, і ты, і ўсе маміны сёстры, і татавы браты... Найбольш з мяне жартуеце, і з прабабкі Нюры.

— Яна — найстарэйшая ў родзе, а ты — найменшы. А жарты — нязлосныя... А ў свята — колькі падарункаў! — смяецца цёця Ганя.

— Надавалі! Шафа ўжо лопае.

— Дык раздай частку сябрам. Ёсць жа дзеці, у якіх няма ні цацак, ні цікавых гульняў. І родных у іх, бывае, няма нікога.

Паўлік варухнуўся на крэсле.

— Э-э-э... Сябрам... Фігу з макам! Каб яшчэ брат быў які, ці сястрычка... Ды і яны — што мне яны. Падарункі — усе мае.

— Гэта справа яшчэ не завершана, калі наконт браціка... Ну, Паўлік, адчыняй свае скарбы!

Неўзабаве Паўлік з цёцяй-студэнткай рушылі з вялікім рукзаком у дзіцячы дом.

Міра Лукша

Каб запоўніць спусцелыя душы...

Конкурс „Роднае слова" штогод успрымаецца ў нашай школе як свята. Амаль 70 святочна апранутых удзельнікаў з павагай чакалі свайго выступлення. Дэкламатараў выклікалі на сцэну Ілона і Ева — вучаніцы шостага класа — можна сказаць, школьныя прафесіяналкі ў канферансье. Ад іх мы пачулі кароткую характарыстыку верша і некалькі слоў пра яго аўтара.

У зале запанавала цішыня. На сцэну выходзіць першая дэкламатарка — Бася Трафімюк, якая шмат разоў прымала ўдзел у розных конкурсах і часта перамагала. І тут першая неспадзяванка... У яе выкананні вельмі кранальны верш нашага земляка Віктара Шведа „Хто мы?".

А потым з іншых вуснаў далятаюць да мяне словы:

Мама!
Так мне рукі твае не бабелі ніколі.
То пасланы ў пакоі не ходнікі —
саматканыя сцежкі-дарогі...
(Я. Янішчыц)

У апошнія гады вучні дэкламавалі казкі і вершы з гумарам, якія лягчэй дэкламаваць, і якія больш прыцягваюць увагу слухачоў. З такім творам і ў гэтым годзе выступіла Эля Млодзян — вясёлая, рухавая дзяўчына, якая дэкламавала так, быццам сама была гераіняй казкі У. Корбана „Чорная бяда".

Аднак у гэтым годзе пераважалі вершы паважныя, патрыятычныя, прыродаапісальныя і вершы пра жыццё, а пачулі мы іх не толькі ў выкананні гімназістаў, але і малодшых сяброў I-VI класаў. Многія з іх самі падбіраюць сабе вершы для дэкламацыі. Гімназістка Аня Герман, у сваёй хатняй бібліятэчцы, у зборніку вершаў гродзенскіх паэтаў „Лябірынты прывіднага замку" знайшла верш А. Брусевіча „Элегія злосці".

Найбольшую групу дэкламатараў склалі вучні I-III класаў Пачатковай школы. Сярод іх перамаглі Эдыта Наўроцкая і Бася Петручук — вучаніцы III класа. Але найбольш эмацыйна да конкурсу падыходзяць першакласнікі. Вядома, яны выступаюць першы раз з беларускай паэзіяй. Ім прыглядаюцца не толькі сябры, настаўнікі, але і бацькі, якія перажываюць не менш за сваіх малеч. Тое, як пакажуць сябе іх дзеці, сведчыць у вялікай ступені пра іх працу і ангажаванасць у вывучэнне вершаў. — Я ўжо сама ведаю напамяць тры вершы, — гаворыць мама Эдыты, — яна ўжо трэці раз прымае ўдзел у конкурсе і з ёю вучыцца цэлая сям'я.

Цяпер, калі хтосьці спытае: „Каму патрэбная беларуская паэзія?", адкажу: „Нашым дзеткам, нашай моладзі, якія, відаць, дасягаюць да кніжак з найвышэйшай паліцы".

А на канец усім тым, хто гаворыць: „Навошта нам гэтая беларуская мова". Разам з дэкламатаркай Івонай Іванюк, падпісваюся пад словамі пісьменніка Ніла Гілевіча:

Я хачу зберагчы цябе,
матчына песня,
Каб запоўніць табою
спусцелыя душы...

9 сакавіка мне, як члену журы, прыемна было ўдзельнічаць у школьным дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова", які адбыўся ў асяродку культуры ў Дубічах-Царкоўных. Конкурс падрыхтавала настаўніца Марыя Казімірук пры выдатнай дапамозе Гміннай бібліятэкі і фінансавай падтрымцы Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

Бажэна Маркевіч

Польска-беларуская крыжаванка № 13

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

►		▼		▼	Krąg	Lud	▼	Sokół
Potok	Twaróg / Lisica		Strefa		Nos	► ▼		
Lazur / Pieróg	► ▼		▼					Dar
►					Rząd	►		▼
Sen	►			Koło	►			
Ogród	►						╳	

Адказ на крыжаванку н-р 9: Бакал, нага, турнір, кола, чын, кіно. Каток, гулі, баран, кліч, рыс. Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Анна Раманюк, Паўліна Чурак** з Белгімназіі ў Гайнаўцы, **Паўліна Даняльчук, Паўліна Мялешка, Эля Шарэйка, Рафал Тамашук** з Дубін, **Аляксандра Дамброўская** з Беластока. Віншуем!

К@мп'ютэрныя пасядзенкі

У адным з нумароў „Нівы" на апошняй старонцы паявіўся цікавы, з гумарам здымак бабулек з партатыўным камп'ютэрам, які прыцягнуў маю ўвагу.

Ці гэта фантастыка?

Думаю, што не такая ўжо фантастыка. У школе ў Дубічах-Царкоўных пры фінансавай падтрымцы Агенцтва развіцця і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ад 12 сакавіка праводзяцца камп'ютэрныя курсы для жыхароў гміны. Калі пытаю дырэктара школы Уладзіміра Антасюка, які вядзе запісы, у якім узросце ўдзельнікі курсаў, са здзіўленнем чую, што і маладыя і бабулі — амаль пяцідзесяцігадовыя жанчыны (вядома, дакладна сказаць не выпадае, жанчына ж заўсёды маладая, як не целам, то духам).

— 9 сакавіка ахвотных было ажно на чатыры 16-асабовыя групы, а ўсё яшчэ звоняць з запытаннямі ў школу, — гаворыць настаўніца інфарматыкі Івона Сяроцкая.

Напэўна вялікім штуршком да таго, каб удзельнічаць у курсах ёсць іх бясплатнасць. А можа і тое, што крыху сорам перад дзяцьмі. Яны ж у гэтай галіне разумнейшыя чым дарослыя, як гавораць „яечка разумнейшае ад курыцы", прызнаюць бацькі. Дзецям камп'ютэр не страшны.

— Калі не маем яго ў хаце, ідзем вечарам да сябра, які мае такую „штучку". Бывае, што пры адным экране сядзіць 5-6 асоб, у кампаніі весялей, — паясняюць дзеці.

Вось і маеш табе вясковыя сучасныя пасядзенкі (калісь сустрэча суседзяў у адной хаце вечарам, каб пагутарыць, абмяняцца навінамі).

— Цяпер бюракратыя ўваходзіць і ў вёску, — гаворыць малады гаспадар, — не хапае выгадаваць карову ці каня, трэба ўсё яшчэ дакладна апісаць. Ужо лепш, каб дзіця нарадзілася, — смяюцца, — бо калі карова ацеліцца, гэта толькі клопат. Трэба паехаць у Гайнаўку запісаць, вырабіць пашпарт, правесці кальцаванне і г.д. Калі хочаш атрымаць даплату, трэба запоўніць дакументы — не ўмееш, не атрымаеш. А, вядома, беларускі гаспадар мае права дастаць тое, што яму належыцца. Ён жа лаяльны грамадзянін, які ўсё жыццё працуе на хвалу і карысць сваёй дзяржавы Польшчы і не такі ўжо няўмека, што толькі чакае, каб за яго зрабілі другія.

www.szkola.zespolszkol.dubicze.webpark.pl

На курсах гаспадары пазнаёмяцца з падставамі абслугі камп'ютэра і Інтэрнэта. Ці варта?

— Думаю, што напэўна так. Хутка ў Дубіцкай гміне пры бібліятэцы будзе адкрыта інтэрнэтавая кафэйка, якая паўстае ў рамках праекта „Іконка". Карыстацца Інтэрнэтам будуць жыхары гміны, — інфармуе кіраўнік гміннай бібліятэкі Міра Семянюк-Мараўская. — Вядома, можна будзе ўвайсці толькі на інфармацыйную старонку, а не на „чат" ці недазволеную пацешку.

Мяне, як настаўніка, вельмі цешыць такое зацікаўленне жыхароў вёсак і бацькоў нашых вучняў інфарматыкай. Калі азнаёмяцца з камп'ютэрам, магчыма, змогуць лепш зразумець і пазнаць сваё дзіця і ўсцерагчы яго перад камп'ютэрнымі паталогіямі.

Дарагія дзеці! — вясной, пасля курсаў, можа так здарыцца, што вашых бацькоў не будзе ў хаце, таму што пойдуць да суседзяў на камп'ютэрныя пасядзенкі.

Бажэна Маркевіч

Метафізічнае Белавежжа

Падляшша — „краіна метафізічная і інтрыгуючая" — гэтак азагаловіла настаўніца і культуразнаўца Аліна Лясонь-Вашкевіч сустрэчу сваіх белавежскіх вучняў — будучых леснікоў з падляшскімі аўтарамі, звязанымі з мастацка-літаратурным часопісам „Карткі" — выдаўцом, паэтам, прыродазнаўцам ды селянінам з замілавання Багданам Дудко, фатаграфікам Віктарам Чарнэцкім, Мірай Лукшай і журналістам, крытыкам і паэтам Пятром Брысачом. Адной з прадстаўленых кніг была „Метафізіка правінцыі", у якой Ян Камінскі размаўляе з падляшукамі з культурнай спадчынай важнай для рэгіёна; м.інш. апынуліся сярод іх Сакрат Яновіч, Уладзімір Паўлючук, Ежы Плютовіч, Лявон Тарасэвіч. Зачытаны былі фрагменты са збору „Апавяданні з-над Нарвы" Міраслава Грыкі з Рыбакоў, Міра Лукша чытала свае „Вершы тутэйшыя", прысвечаныя жыхарам і месцам Падляшша. „Мы — адсюль. З Вялікага княства і Падляшша. Ляхі, ліцьвіны, русіны. Бязмежнае пагранічча. Мы — з маёй душы. Мы — згэтуль. І Вялікае княства ўсё існуе. І тыя — каго няма, як палымяная Алаіза Пашкевічанка, сухотная рэвалюцыянерка, даваенны пасол Браніслаў Тарашкевіч, чые імёны зацiхлі на зганьбаваных сцягах і каменных табліцах, і ціхая друкарка Вера. Вера. Люба. Надзея. Браніслаў. Георгіі-Юрыі-Ежы — ратаі Богам даныя на ратунак душы, на зааранне падляшскае нівы. Пачцівыя Мікалаі, ваяўнічыя Міхалы не з нябесных часцей. Збіральнікі песень забытых, якія ў сэрцы адгукнуцца і аддзячацца. Моцныя стомленыя і ціхія. Вялікія па-над лугамі, якія залівае бяспамяць... Не тыя «тутэйшыя», што ўласнага ценю баяцца, нацыі і Бога ўслаўленага ўласным словам. З поля і лесу, над якімі ёсць Ён, над нашым месцам. Цісоўка. Бандары. Нарва. Гайнаўка. Бельск. Гушчэвіна. Міхалова. Крывая. Катлоўка. Ялоўка. Рыбалы. Маліннікі. Рыбакі. Тапаляны. Гарадок. Баравыя. Таніца. Міклашэва. Мора. Зэльва. Валілы. Сакі. Саколка. Ярылаўка. Раманава. Беласток. Крынкі... Месцы пусцеючыя. Ды не пакінутыя. *Мая тканка біяграфіі. Гляджу ў глыб неба — і заўважаю сябе. Спаглядаю ў корань зямлі — бачу непрысутнасць (Тадэй Карабовіч)...*"

Моладзь, сабраная з усяе Польшчы, але ў большасці тутэйшая, асабліва рэагавала на канкрэтныя назвы, блізкія — адкуль яны самі, скуль ведаюць людзей. Высакапарная „метафізіка" гэта для большасці вучняў, як вынікла з дыскусіі, таямніцы роднае прыроды, родны дух. Інтрыгуе іх, можа, лепш сказаць, проста зацікаўляе, як звычайныя людзі, выхадцы з вядомых іх мясцовасцей — з Цісоўкі, Баравых, Замбрава, Гайнаўкі раптам сталі занатоўваць звычайнае, а гэта стала літаратурай ці мастацкім фотаздымкам. Сярод іх калег ёсць таксама будучыя літаратары, можа, якія толькі на ўласны ўжытак будуць запісваць красу, будучы лесніком, а, можа, якія стануць больш вядомымі. Пісьменнікамі. Здаўна дзейнічае ў белавежскім Лясным тэхнікуме Літаратурны гурток, у якім набылі вядомасць Стась Хім ці Пятро Цялешчык, лаўрэат агульнапольскага конкурсу „Рэзьба слоў". Вучні разважалі разам з Багданам Дудко, адным з заснавальнікаў і кіраўнікоў Паўночнападляшскага таварыства аховы птушак, на тэму адносін паміж мастацтвам і натурай і адказвалі, чым для нас усіх ёсць лес.

Лясны тэхнікум у Белавежы, дзякуючы такім няўрымслівым і цікаўным свету асобам, як паланістка Аліна Лясонь-Вашкевіч ды кіраўнік інтэрната Яўген Паўлючук, вядзе не толькі „звычайную" працу навучання леснікоў, але і уводзіць іх у свет культуры, адкрывае іншыя шляхі.

(куша)

За посным сталом

Посныя стравы вельмі смакавалі вучням, іх бацькам і бабулям, якія нядаўна сустрэліся ў рэгіянальнай ізбе Падставовай школы н-р 6 у Гайнаўцы. Нагодай для спаткання было падвядзенне вынікаў конкурсу „Наша школьная рэгіянальная кухарская кніжка", у якім прынялі ўдзел 80 вучняў. Запісалі яны каля 100 рэцэптаў страў, якія ў мінулым варылі іх бабулі.

Мерапрыемства распачалося з дэкламацыі беларускіх вершыкаў вучнямі І „а" і ІІІ „а" класаў. Гражына Паўлючук, выхавацелька І „а" класа і арганізатар мерапрыемства паінфармавала, што кулінарныя працы былі цікавымі і добра падрыхтаванымі. Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі ўзнагароды, а 15 дзеткам за найлепшыя працы дырэктар школы Ірэна Кулачэўская і асветны інспектар Гайнаўскага магістрата Нэля Шчука ўручылі кніжныя падарункі. Найцікавейшыя рэцэпты былі вывешаны ў рэгіянальнай ізбе, побач кніжак аб беларускай і польскай кухні. Часта паўтараліся рэцэпты на выкананне бліноў з варанай бульбы, кісялю з аўса, бульбянай кішкі, свойскага хлеба і „каплуну" — супу, што робіцца з вады, у якой варылася бульба і скарынак чэрствага хлеба.

У суседняй зале ізбы, дзе захоўваюцца даўнія прылады працы, беларускія ручнікі і іншыя палатняныя вырабы быў арганізаваны посны стол. Мамы і бабулі вучняў І „а" класа падрыхтавалі смачныя посныя стравы. Апрача вышэйзгаданых падрыхтаваны былі дражджавыя і бульбяныя аладкі, капуста з грыбамі, бульба з цыбуляй і дражджавыя булкі. Каля стала паставілі дзежку, гліняныя гаршкі, паклалі драўляныя лыжкі, якія выкарыстоўваліся ў колішніх кухнях.

Найбольш страў падрыхтавала Ніна Карбоўская з Гайнаўкі. Яна расказвала, як калісь рыхтавалі харчаванне і па чарзе паказвала дзеткам кулінарныя вырабы, якімі пасля частавалі гасцей, вучняў і іх бацькоў.

— Усе стравы былі вельмі смачнымі, асабліва спадабаліся мне дражджавыя булкі. Мы даўно не елі такіх вясковых страў, — заявіла адна з удзельніц сустрэчы.

— Мая мара — з сабраных рэцэптаў скласці кухарскую кніжку. Без бацькоў маіх першакласнікаў я нічога не зрабіла б. Яны памагалі мне ўва ўсім, — заявіла Гражына Паўлючук. — Вершыкі для дэкламацыі былі на беларускай мове. Хаця першакласнікі не ведаюць беларускіх літар, але навучыліся іх напамяць, дзякуючы бацькам.

Вучні І „а" класа вельмі ахвотна выступаюць у беларускіх мерапрыемствах. Дар'я Шыманюк і Ася Целушэцкая перайшлі да раённых элімінацый Конкурсу беларускай мовы „Роднае слова".

— Спачатку мы хочам пазнаёміцца са сваім, беларускім, а пасля будзем вучыцца пра іншыя культуры. Дзякуючы такім мерапрыемствам дзеткі вучацца пашаны для роднага, знаёмяцца з традыцыяй і даведваюцца кім былі іх продкі, — сказала Гражына Паўлючук. — Такія спатканні інтэгруюць бацькоў і вучняў. Узбагачаюць яны беларускую літаратурную мову.

Мерапрыемства праводзілася ў рамках праекта „Захаваць ад забыцця. Мая малая айчына Гайнаўка", які рэалізуецца дзякуючы гранту Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча — Беларусь.

Аляксей Мароз

IX Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы” і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб’яўляюць IX Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы.

Тэматыка

Арганізатары не абмяжоўваюць тэматыкі дасыланых твораў. У конкурсе будуць разглядацца працы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— I група: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— II група: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з’яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на машынцы або разборлівы рукапіс у трох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб’ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 149 з прыпіскай на канверце: IX Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **31 ліпеня 2004 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб’яўлены ў канцы верасня 2004 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі грашовыя і рэчавыя ўзнагароды. Дапускаюцца таксама ўсялякія іншыя ініцыятывы арганізацый і прыватных асоб з мэтай павелічэння колькасці ўзнагарод. Арганізатары будуць садзейнічаць такім ініцыятывам.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

3. Журы можа не выкарыстаць усяго фонду ўзнагарод.

4. Арганізатары прадугледжваюць магчымасць публікацыі ўзнагароджаных твораў (без права аўтараў на гаранары) на старонках „Нівы”, у агульнапольскім друку і па радыё.

Заключныя заўвагі

1. Працы, якія не адпавядаюць правілам конкурсу, не будуць разглядацца.

2. У справах, якія вынікаюць з супярэчлівага тлумачэння правілаў, канчатковае рашэнне выносяць арганізатары ў паразуменні з журы.

3. Сакратарыят конкурсу: Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 743 50 22.

Наш забыты мастак

У 2003 годзе мінула 140 гадоў як памёр Міхал Кулеша — мастак і настаўнік мастацтва, знакамітая постаць беларускага культурнага жыцця.

Жыццё і праца мастака цесна звязаны з Беласточчынай. Тэмай яго творчасці былі краявіды, фальклор і гістарычныя помнікі мінуўшчыны Беларусі.

Міхал Кулеша нарадзіўся ў 1800 годзе ў Вільні. Першыя лекцыі браў у мастака Яна Дамела, заахвочаны ім, у 17-гадовым узросце паступіў у Інстытут мастацкіх навук пры Віленскім універсітэце. Там вучыўся пад наглядам Яна Рустэма. Першыя працы паказаў у 1820-22 гадах на школьных выстаўках. Прадстаўлялі яны копіі ландшафтаў Рустэма і ўласныя эскізы краявідаў. Гэтым ён першапачаткова заіснаваў у мастацтве і атрымаў добрую ацэнку крытыкаў.

Міхал Кулеша, Гетман

Пасля заканчэння навукі, Кулеша працаваў настаўнікам рысункаў у ксяндза Гераніма Друцкага-Любецкага ў Луніне. Там захаплялі яго краявіды Палесся. У той час ездзіў па Віленшчыне, рабіў эскізы з ваколіц Ліды, Навагрудка і Пінска. Яго працы заказвалі Пуслоўскія, якім намаляваў інтэр’ер капліцы св. Казіміра пры Віленскай кафедры і касцёла Пана Езуса на Антокалі ў Вільні.

Да 1837 года Міхал Кулеша жыў у Крыме у свайго мецэната Фелікса Влодка. З гэтага часу засталіся краявіды поўдня Крыма.

Пасля Кулеша працуе настаўнікам найперш на Жмудзі, потым у Гродне, а ад 1844 года — у Беластоку. Яго творчасць становіцца больш папулярнай дзякуючы І. Крашэўскаму, які памагаў яму прадаваць абразы, рэкамендаваў іншым мастакам і пісаў пра яго творчасць на старонках „Atheneum”. Міхал Кулеша працаваў нават для самога цара і Пецярбургскіх таварыстваў навук. Працуючы настаўнікам Кулеша кожны вольны час прысвячаў развіццю сваіх ведаў і мастацкіх здольнасцей. Ездзіў па Літве, Палессі, Валыні і Падоллі, каб пазней стварыць праўдзівыя і высокага рангу малюнкі.

У 1852 г. выдатны ўжо мастак выдае пры дапамозе Крашэўскага некалькі сваіх прац, сабраўшы іх у „Тэку”.

Пры канцы жыцця — за дваццаць гадоў педагагічнай дзейнасці на Беласточчыне — атрымаў медаль.

Міхал Кулеша памёр 3 лістапада 1863 года ў Беластоку. Мастак пакінуў па сабе немалую спадчыну, у тым ліку карціны з выявай царквы ў Супраслі, палаца Панятоўскіх у Харошчы, помніка Аўгуста III у Белавежскай пушчы, царквы св.св. Барыса і Глеба ў Гродне, гродзенскіх замкоў, замка Радзівілаў у Міры. Карціны мастака вельмі цікавыя і адлюстроўваюць яны не толькі архітэктуру, але і навакольны свет, які вылучаецца далікатнасцю і лёгкасцю. Гэта не толькі мой уласны погляд, але таксама выдатных крытыкаў, якія творчасць Міхала Кулешы ацанілі станоўча.

Альжбета Колтак

Люблінская унія

Частка II

Дзякуючы супольным намаганням Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага, ВКЛ удалося пазбегчы паражэння ў вайне з Маскоўскай Руссю. Новы кароль і вялікі князь Стэфан Баторый (1576-1586), які пачаў мабілізацыю сіл абедзвюх дзяржаў, пачаў рашучыя ваенныя дзеянні і ў выніку трох кампаній давёў вайну да пераможнага канца. 30 кастрычніка 1579 г. яго армія заваявала Полацк, а пасля года закончыла вызваляннe акупаваных зямель Беларусі; затым ваенныя дзеянні перайшлі на тэрыторыю Вялікага княства Маскоўскага. Беларускія землі былі асвабоджаны. Падпісаны ў 1582 г. Ям-Запольскі мірны дагавор пацвердзіў паражэнне нанесенае Маскоўскаму царству і вярнуў беларуска-літоўскай дзяржаве не толькі адваяваны Полацк, але таксама іншыя этнічныя беларускія землі: напрыклад, Невель і Веліж, якія былі страчаны ў час вайны 1500-1503 гадоў.

У XVII стагоддзі царства Раманавых пераўтварылася ў адну з самых магутных краін у Еўропе, якой тэрыторыя і ваенная сіла будуць пастаянна расці, а канчатковае вырашэнне канфлікту з Вялікім княствам Літоўскім стане толькі справай часу.

Аб’яднанне абедзвюх дзяржаў і абодвух (канешне, палітычных, бо этнічных было сама меней чатыры) нацый у федэратыўную Рэч Паспалітую не давялі да уніфікацыі іх палітычных сістэм. Вельмі хутка выявілася нязгоднасць інтарэсаў і прыярытэтаў абедзвюх дзяржаў. Пана-рада карысталіся кожнай нагодай, асабліва перыядам міжцарства, каб замацоўваць асновы палітычнай самастойнасці сваёй дзяржавы ў рамках уніі.

Ужо тры гады пасля Люблінскага сойма, пасля смерці апошняга Ягелона, калі дынастычныя сувязі Кароны і Вялікага княства парваліся, Паны-рада вылучылі асобную кандыдатуру на манаршы трон. У 1573 г. сенатары Вялікага княства Літоўскага запатрабавалі вярнуць украінскія землі і на з’ездзе ў Вільні, насуперак пастановам уніі, самастойна вырашылі, каб даходы з Падляшша і Валыні, так як раней, паступалі ў казну Вялікага княства Літоўскага. Парушаючы акт Люблінскай уніі, віленскія палітыкі ўвялі асобную прысягу для манарха і асобнае пацвярджэнне правоў Вялікага княства Літоўскага. Пасля адабрэння іх першым элекцыйным каралём і вялікім князем Генрыхам Валуа (1573-1574) новыя распараджэнні сталі законнай нормай.

Перад вальным соймам Рэчы Паспалітай сенатары і шляхецкія паслы з усёй краіны збіраліся на свой *генеральны сойм*, у ходзе якога паводле інструкцый з павятовых соймікаў распрацоўвалася супольная праграма і пазіцыя Вялікага княства Літоўскага. Такія соймікі адбываліся ў Ваўкавыску, потым у Слоніме на два тыдні да варшаўскага сойма. Апрача генеральнага сойміка ў сямідзесятых гадах XVI стагоддзя ў Вялікім княстве паявіўся яшчэ адзін агульнадзяржаўны парламенцкі інстытут — генеральны з’езд, або інакш галоўны, называны віленскай канвакацыяй (таму, што ўпершыню адбыўся ён у Вільні). Фактычна была гэта іншая форма вальнага сойма Вялікага княства Літоўскага перыяду да Люблінскай уніі. Канвакацыю склікаў манарх, але рабіў гэта па прапанове сенатараў; разглядаліся на ёй тэрміновыя справы датычныя абароны, фінансаў і падаткаў. У якасці заканадаўчага інстытута надзвычайнага характару віленская канвакацыя пратрывала да канца XVII стагоддзя. Праўда, не пераняла яна ўсіх функцый вальнага сойма, таму што ўхваляннe законаў і падаткаў знаходзілася ў кампетэнцыі сойма Рэчы Паспалітай. Сойм Рэчы Паспалітай адбываўся ў Варшаве (сойм, які ў 1653 г. адбыўся ў Брэсце, складае выключэнне) да гэтай пары, калі палітычны народ Вялікага княства Літоўскага не дамогся, каб ад 1673 г. кожны трэці сойм (апрача элекцыйных, канвакацыйных і каранацыйных соймаў) адбываўся на яго тэрыторыі ў Гродне.

На тэрыторыі Рэчы Паспалітай адсутнічала аднародная судовая сістэма. Калі ў Польскай Кароне ў 1578 г. створаны быў Каронны Трыбунал і кароль страціў прэрагатывы вышэйшай апеляцыйнай інстанцыі для шляхты, то ўжо ў 1581 г. такі інстытут быў створаны ў Вялікім княстве Літоўскім. Быў гэта Галоўны Літоўскі Трыбунал. Члены трыбунала выбіраліся на соймікі (па два дэпутаты ад павета), а пасяджэнні адбываліся ў Вільні, Мінску і Навагрудку (пераменна праз год). Узнікненне гэтых інстытутаў завяршыла працэс фармавання вышэйшых дзяржаўных улад Вялікага княства Літоўскага — айчыны продкаў сённяшняга беларускага народа.

(працяг будзе)

Пятро Хомік

Сайт дазваляе прасачыць, з якімі праблемамі сустракаліся і сустракаюцца СМІ Беларусі...

http://baj.ru

Займацца журналістыкай цікава. Займацца журналістыкай у Беларусі цікавей удвая, бо не заўсёды бяспечна. Асабліва гэта тычыцца тых майстроў пяра, што пішуць на сацыяльна-палітычныя тэмы і займаюць, адпаведна, яскрава выражаную грамадскую пазіцыю. Тым не менш, гэтыя людзі не застаюцца адзін на адзін з разнастайнымі праблемамі, якія час ад часу паўстаюць на іх прафесіянальным шляху. І дапамагае ім, аб'ядноўвае і дае парады Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) — арганізацыя, аб прысутнасці якой у Інтэрнэце мы сёння і пагаворым.

Калі віртуальны вандроўнік набярэ адрас http://baj.ru, то перад яго вачыма адкрыецца шэра-зялёнае выяўленне вышэйзгаданай арганізацыі. Адразу бачна, што сайт існуе дзякуючы, між іншым, сур'ёзнаму прафесіянальнаму падыходу ягоных распрацоўшчыкаў і тых, хто забяспечвае старонку матэрыяламі. „Навіны", а менавіта гэтая рубрыка знаходзіцца ў цэнтральнай частцы „карцінкі", аднаўляюцца практычна штодня. Зразумела, у асноўным яны — аб падзеях так ці інакш звязаных з беларускімі мас-медыямі, але ўжо па гэтых паведамленнях можна скласці прадстаўленне аб стане з асноўнымі свабодамі і правамі чалавека ў Беларусі. Асабліва гэта тычыцца свабоды слова. Бо менавіта словам адрозніваецца чалавек ад жывёлы, а майстэрскае карыстанне ім можа зрабіць з чалавека журналіста. На жаль, гэтая свабода даволі часта становіцца аб'ектам прыцяснення з боку тых, хто знаходзіцца на вяршыне беларускай улады, бо, відаць, імі ўжо вырашана, хто можа казаць што заўгодна, а хто не. У гэтым, дарэчы, і ёсць асноўная прычына многіх няшчасцяў беларускага постсавецкага грамадства і змест БАЖаўскага сайта таму пацвярджэнне.

Уверсе пад загалоўкам старонкі падаюцца рубрыкі сайта. „Адукацыя", „Юрцэнтр", „Камісія па этыцы" ідуць першымі і калі цікаўны карыстальнік зазірне ў іх, то знойдзе для сябе шмат карыснай інфармацыі. Асабліва, калі вы пачынаючы журналіст, вам будзе няблага даведацца аб тых адукацыйных праграмах і праектах, якія працуюць з удзелам БАЖ. Дзве далейшыя рубрыкі памогуць лепей скаардынавацца ў правілах паводзін. А менавіта гэты чыннік журналісцкай дзейнасці часам выходзіць на першы план і толькі ад яго можа залежыць ці складзецца ўвогуле ваша журналісцкая кар'ера. Дарэчы, гэта тычыцца не адных пачаткоўцаў, але і „акул пяра".

Рубрыка „Маніторынг" дазваляе прасачыць на працягу некалькіх гадоў, з якімі праблемамі сустракаліся і сустракаюцца незалежныя масмедыя ў Беларусі.

„Бібліятэка" прапануе пазнаёміцца з выданнямі, якія тычацца беларускай журналістыкі, асобных падзей і здарэнняў у ёй. Так, напрыклад, можна пачытаць адмыслова сабраныя артыкулы ў брашуры „Чаму закрылі «Пагоню»", праўда — толькі на расійскай мове.

Прыемна адзначыць, што на сайце ёсць магчымасць азнаёміцца са зместам такіх цікавых выданняў як „АБАЖУР", „Медиа-Эксперт" і „БАЖаня". У іх знаходзяцца артыкулы, што тычацца асноўных праблем беларускага грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця.

Варта адзначыць, што мова сайта беларуская і расійская. У той жа час англамоўны карыстальнік можа пазнаёміцца з яго зместам па-англійску. Цікава, што ў англійскай версіі зусім іншае выяўленне, як, дарэчы, і ў архіве навін за 2001 год. Менавіта з таго года, відаць, і з'явіўся БАЖ у Інтэрнэце.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларускія спартсмены ад Хельсінкі да Афінаў

Беларусь, беларусы...


Віталь Шчэрба, www.olympic.org

Эталоны Барселоны
(1992, Барселона, 25 медалёў)

Савецкі Саюз ужо разваліўся, але на алімпіядзе ў сталіцы Каталоніі выступала дружына Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У яе складзе і прыехалі беларусы на Пірэнейскую паўвыспу. Поўным і галоўным трыумфатарам гэтых гульняў стаў беларускі гімнаст **Віталь Шчэрба**. 6 залатых медалёў ва ўсіх гімнастычных намінацыях — такога свет яшчэ не бачыў! Залатымі лаўрэатамі таксама сталі гімнастка **Святлана Багінская**, баскетбалісткі **Ірына Сумнікава** і **Алена Швайбовіч**, гандбалісты **Андрэй Барбашынскі**, **Андрэй Мінеўскі**, **Міхаіл Якімовіч**, весляры **Дзмітрый Даўгалёнак** і **Аляксандр Масяйкоў**, плыўчыха **Алена Рудкоўская** (на яе рахунку таксама бронза), стралок з пісталета **Канстанцін Лукашык**, штангіст **Аляксандр Курловіч**. Срэбныя медалі прымералі барэц вольнага стылю **Сяргей Смаль**, лёгкаатлеты **Наталля Шыколенка** (кіданне дзіды) і **Ігар Астапковіч** (кіданне молата), штангіст **Леанід Тараненка**. Бронзавыя медалі здабылі барэц-вольнік **Вугар Аруджаў**, барэц грэцка-рымскага стылю **Сяргей Дземяшкевіч**, вясляркі **Кацярына Хадатовіч** і **Алена Хлопцава**, тэнісістка **Наташа Зверава**.

Паводле індывідуальнага медальнага заліку беларусы сталі на алімпіядзе 9-мі з усіх краінаў-удзельніцаў. Гэта быў найвышэйшы поспех айчыннага спорту ў гісторыі алімпіядаў. На другіх запар гульнях перамагла Святлана Багінская. Багіня, як яе называлі, у гімнастычных практыкаваннях была ўвасабленнем жаноцкасці. Пасля яе зыходу сусветная гімнастыка страціла вельмі шмат, а ў беларускай увогуле стварыўся вакуум. Гродзенскі хлопец Косця Лукашык стаў чэмпіёнам у 16-гадовым узросце — такога нікому з айчынных спартоўцаў не ўдавалася — ні да таго, ні пасля.

Першы медаль у вялікім тэнісе для Беларусі ў гісторыі заваявала Наташа Зверава. Ізноў парадавалі гандбалісты — ураджэнец Ашмянаў — Барбашынскі, Гародні — Мінеўскі, Слуцка — Якімовіч. Міхаілу Якімовічу Іспанія прыйшлася даспадобы. Выступаючы пазней за тамтэйшыя клубы ён значна папоўніў сваю калекцыю кубкавых трафеяў, якую пачаў збіраць яшчэ ў складзе славутага мінскага СКА. Сёння Якімовіч — адзін з самых тытулаваных гандбалістаў свету.

Аляксандр Курловіч, пачэсны грамадзянін Гродна, значны час лічыўся мацнейшым чалавекам планеты. Шкада, што пазней гэтага асілка, які 12 разоў біў рэкорды свету, спасцігла допінгавая дыскваліфікацыя. Такая прырода сённяшняга спорту — анаболікі спажываюць у бальшыні відаў спаборніцтваў.

Падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч

Беларускі канцэрт у „Фабрыцы"

Апошнім часам быў я на трох канцэртах — вялікай польскай зоркі Касі Кавальскай, узыходзячай зоркі музыкі гіп-гоп „Jeden Osiem L" і ў суботу, 20 сакавіка, гуртоў „Zero-85", „Rima", „Drapped Fel" і „Н.Р.М." Паколькі два першыя канцэрты гуртоў, добра вядомых беластоцкай публіцы, прыцягнулі невялікую колькасць гледачоў, дык канцэрт беларускіх музыкаў здзівіў нават самога арганізатара канцэрта. Спадар Юры Бярыла, фанат „Н.Р.М.", вырашыў сарганізаваць мерапрыемства па ўласнай ініцыятыве. Пры дапамозе Бодка з „Zero-85" удалося гэта яму выдатна.

— Каб я ведаў, што столькі людзей прыйдзе, дык зняў бы большую залу, — сказаў мне спадар Бярыла.

Дзіўнае, бо наколькі ведаю, паб „Фабрыка" можа змясціць каля 300 асоб. Больш дзіўнае, што яшчэ столькі ж людзей вярнулася назад, бо забракавала квіткоў! Большасць публікі складала моладзь. Былі ўсё ж і старэйшыя слухачы і, нягледзячы на тое, што са сцэны „веяла" жорстка і голасна, не мяшала гэта ім захапляцца беларускай музыкай. Цешыць, што было вельмі мала асоб, якія мне вядомы асабіста, абазначае гэта, што бел-рок мае на Падляшшы ўсё больш маладых аматараў.

Як першы выступіў абсалютна беластоцкі гурт „Zero-85". Зараз вельмі добры час у ягоным творчым існаванні. Як удалося мне даведацца, хлопцы выступаюць у сярэднім адзін раз на тыдзень па ўсёй Польшчы. Толькі віншаваць! Канцэрт у „Фабрыцы" вельмі энергетычны і цікавы. Новая афарбоўка анімацыйнага асвятлення, як заўсёды моцны вакал Юркі Асенніка, ды ўсё мацней псіхадэлічныя апрацоўкі вядомых гітоў гурту ўвялі публіку ў даволі моцны транс. „Zero-85" пачало канцэрт песняй „Страчаная Ітака". Ці сапраўды страчаная? Хто быў на канцэрце, той напэўна думае інакш.

Чарговай на сцэне з'явілася „Rima". Пасля выхаду новага альбома „Прадаем сябе" гурт прэзентуе на канцэртах новы матэрыял. Трэба сказаць што наколькі хлопцаў з „Rimy" можна не любіць, дык іхняй музыкі не любіць нельга. Ужо сам пачатак канцэрта даказаў, што кепскае выступленне ў час Басовішча-2003 гэта толькі маленькі збой у працы. „Rima" заўсёды мела верную публіку. Так яно было і ў гэты раз. Паколькі новыя гіты не так цёпла ўспрымаліся на пачатку, дык пазней гледачы поўнасцю аддаліся свайму ідалу. З поўнай адказнасцю магу сказаць, што „Rima" была самым лепшым пунктам цэлага канцэрту.

Фота АЛЬЖБЕТЫ СЕБЯТЫНСКАЙ

Сціск быў экстрэмальны

Недзе 8-10 гадоў назад амаль кожны жыхар Беластока ведаў гурт „Drapped Fel". Сёння... некаторыя яшчэ яго памятаюць, але... Як толькі на сцэне з'явіўся адзін з больш надзейных гуртоў Беласточчыны 90-х гадоў папярэдняга стагоддзя, пад сцэнай зрабілася крыху пуставата. Усе чакалі зорку вечара — гурт „Н.Р.М."

Як сказаў мне яшчэ да канцэрта Алезіс, бубнач „Н.Р.М.", зараз у гурта вельмі добры час. „Н.Р.М." грае вялікі тур, які лічыцца ў тысячах кіламетраў і налічвае больш за дзесяць канцэртаў. Калі я спытаў Лявона Вольскага пра здароўе, той здзівіўся:

— А што, я так кепска выглядаю?

Як выглядаў можна было ўбачыць у час выступу. Столькі энергіі ў Вольскага не бачылі мы ўжо даўно. Канцэрт працягваўся больш за гадзіну. Лявон, спачатку ў гальштуку, зараз жа яго зняў, бо было надта горача і энергетычна. Гурт „Н.Р.М.", праўду кажучы, ужо даўно выпрацаваў сваё музычнае „я" і на канцэрце ўсе змаглі з гэтым „я" ў чарговы раз засіміляваццa. Усё ж такі ўсё часцей чуваць, што час „Н.Р.М." ужо скончыўся, што гэты гурт павінен аддаць сцэну малодшым, што „Н.Р.М." ужо не ў змозе паказаць нічога новага. Думаю, што канцэрт у „Фабрыцы" даказаў, што гэтыя думкі і словы не павінны ажыццявіцца.

Наколькі памятаю, падобных канцэртаў у Беластоку было тры, можа чатыры. Усе як мёд вабілі агромную колькасць гледачоў. Астатні канцэрт даказаў, што зараз вялікае запатрабаванне на бел-рок. Паказаў ён таксама, што нашы беларускія культурныя арганізацыі гэта калекі, якія вялікія грошы топяць у чорт ведае чым, а рок-канцэрты вымушаны арганізаваць зусім прыватныя асобы, такія як спадар Юрка Бярыла. Дзякую спадару Бярылу, а словы непашаны кірую ў бок нашых „паважаных дзеячаў".

Татка Стэп

АКАДЭМІЧНЫЯ ДНІ ПРАЦЫ

Ад 17 да 20 сакавіка ў Беластоку прайшлі Акадэмічныя дні працы, арганізаваныя беластоцкай Сеткай бюро кар'ер. Чатыры дні студэнты і выпускнікі беластоцкіх школ, да якіх была адрасавана акцыя „актыўных пошукаў працы", удзельнічалі ў курсах і прэзентацыі фірмаў з нашага рэгіёна.

Дваццаць фірмаў прапанавала новыя месцы працы для амбітных і здольных маладых людзей з Падляшша. Усё было б цудоўна, каб атрыманне пасады было сапраўды магчымым і так простым, як запэўнівалі арганізатары. З ліку чатырох соцень студэнтаў, якія паявіліся на мерапрыемстве, аптымістаў не было многа. І няма чаму дзівавацца, бо такога тыпу спатканні не ствараюць рэальных шанцаў на працу.

— Я апынулася тут невыпадкова, — гаворыць студэнтка пятага курса юрыдычнага факультэта Магдаліна Ардэцкая. — У гэтым годзе канчаю вучобу і час падумаць аб будучыні... Жыву ў Сейнах, аднак думаю астацца ў Беластоку. Баюся, што так, як у маім родным горадзе, так і тут не знайду працы. Праўду сказаўшы, шанцаў на працу ў маёй прафесіі няма, бо ніхто не патрабуе юрыста без вопыту, якога нават здабыць няма дзе, — і дадае з нуткай аптымізму ў голасе: — Ды трэба шукаць занятку, хаця б на некалькі месяцаў.

Сярод шукаючых працу былі выпускнікі рускай і беларускай філалогій.

— Ніколі я б не падумала, што могуць быць такія праблемы з працай, — гаворыць русістка Агнешка Сямяцкая. — Цяпер ніхто не патрабуе настаўніка рускай мовы, а кожны візіт у школе канчаецца так сама: „Dziękujemy, ale nie potrzebujemy nowych nauczycieli!" Нават у куратоpыі не маюць ніякіх прапаноў. А Дні працы хаця ствараюць магчымасць даведацца пра запатрабаванне рынку працы. Але нават гэта нас не суцяшае, бо кожны ведае, што працу можна дастаць, дзякуючы „добрым плечам"... А тут сабраліся тыя, якія іх не маюць.

Арганізатары вырашылі дапамагчы маладым людзям наладзіць непасрэдны кантакт з працадаўцамі,між іншым, фірмамі Unibud, Opel, Stekom, Era GSM.

На размову ў справе працы на пасадзе дарадцы па бізнесе ў фірме Era GSM дагаварыўся Лукаш Дэмянюк, студэнт пятага курса маркетынгу Беластоцкага політэхнічнага інстытута.

— Спадзяюся, што размова закончыцца поспехам, бо патрабую працы, а з маіх інфармацый вынікае, што праца ў Эры цікавая і добра платная.

Зацікаўленыя працай студэнты мелі магчымасць пагаварыць з прадстаўнікамі фірмаў, псіхолагамі і дарадчыкамі, якія мелі памагчы ў вызначэнні прафесійных схільнасцей. Дні працы праходзілі на беластоцкіх ВНУ. Студэнты, якія прысутнічалі ў курсах, маглі даведацца аб праблемах, з якімі найчасцей прыходзіцца змагацца ў час пошукаў працы, і спосабах іх пераадольвання. Пошукі работы ў нашым рэгіёне, планаванне сваёй кар'еры, кіраванне сабой, спосабы барацьбы са стрэсам, пісанне біяграфіі — гэта толькі некаторыя з тэмаў, якія ставіліся на спатканнях.

Вялікім зацікаўленнем карысталіся выезды за працай за мяжу, спалучэнне працы з практычнай навукай мовы. Хаця ўдзельнікі маглі даведацца многа новага, мала хто з іх у хуткім часе знойдзе працу.

Паўліна Шафран-Асташэвіч

ЗАПРАШЭНЬНЕ

Беларускае культуранае таварыства „Хатка" запрашае на 86-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі.

У праграме:

1. Складаньне кветак на магіле Лукаша Дзекуць-Малея, 26.03.2004 г., гадз. 15⁰⁰, гарнізонны могільнік у Гданьску (за вакзалам ПКС, вул. Ген. Дамброўскага, 2.

2. Прэзэнтацыя кніжак Анелі і Вэранікі Каткавічанак „Od Budsławia do GUŁagu" і Галены Глагоўскай „Białorusini na Wybrzeżu Gdańskim" — уступнае слова праф. Анджэй Хадубскі, 26.03.2004 г., гадз. 17⁰⁰, Сопат, Дворык Серакоўскіх, вул. Чыжэўскага, 12.

3. Канцэрт баладаў Віктара Шалкевіча „Вялікае княства Літоўскае".

* * *

Ад імя Беларускага Аб'яднаньня Аўстраліі я вітаю Вас і ўсіх Вашых супрацоўнікаў і чытачоў з Днём Волі — 86-мі Угодкамі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Актам 25-га Сакавіка 1918 г. і жадаю Беларускаму Народу посьпеху ў абароне Незалежнасьці сваёй краіны — Беларусі.

Няхай Вечна Жыве і Квітнее Незалежная Рэспубліка Беларусь!

Алесь Алехнік, Генеральны сакратар Беларускага Аб'яднаньня ў Аўстраліі

Рэдакцыя „Нівы" просіць прабачэння за дапушчаную памылку ў папярэднім нумары ад 21 сакавіка 2004 г. У матэрыяле А. Мароза прысвечаным памяці дырэктар Бельскага беларускага ліцэя Зінаідзе Навіцкай памылкова надрукаваны месяц смерці спадарыні Навіцкай. Дырэктар ліцэя адышла ад нас **у сакавіку**, а не ў лютым, як мы напісалі. *Рэдакцыя.*

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Малады мужчына (28 гадоў), тэхнічная адукацыя, уласная грузавая машына, шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 0608 151 373.

• Ахвотна заапякуюся малымі дзяцьмі, стаж працы, закончаны педагагічны інстытут, рэкамендацыі, тэл. 732 50 96.

• Шукаю працу ў Бельску-Падляшскім, мне 42 гады, маю кніжку здароўя, санітарны мінімум і 7-гадовы вопыт працы ў магазіне, тэл. 730 00 46.

• Пенсіянерка з вопытам у гандлі, санітарны мінімум, веданне фіскальнай касы шукае працу ў Беластоку, тэл. 0501 668 475.

• Малады электрамеханік, сярэдняя адукацыя, кніжка здароўя, тэл. 0692 438 475.

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602 769 109.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, добрае веданне англійскай мовы, правы кат. В, уласная машына (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 651 36 96.

• Будаўнічыя правы, санітарны мінімум — любая праца ў Беластоку, тэл. 711 83 49.

• Камерсант з вопытам, правы кат. В, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы, сярэдняя тэхнічная адукацыя, тэл. 0601 325 011.

• Маю 32 гады і шукаю працу ў Саколцы і ваколіцах, ахвотна ў кветкавым магазіне, абслуга камп'ютэра, тэл. 711 85 35.

• Жанчына, 47 гадоў, шукае часовую працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 730 63 16.

• Сярэдняя адукацыя, абслуга камп'ютэра, веданне механікі, сумленны, шукае працу, тэл. 0693 044 250.

• Апякунка дзяцей, вопыт за мяжой, спакойная, без дрэнных схільнасцей, тэл. 0504 942 107.

• Вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. В, кніжка здароўя, фіскальная каса (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0506 489 040.

• Маладая студэнтка-завочніца, добрае веданне англійскай мовы, абслуга камп'ютэра, правы кат. В (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0508 753 167.

• Мужчына 37 гадоў, механік з вопытам шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, С, тэл. 0604 960 657.

Дапамагаем сабе ўзаемна

Перад Вялікаднем, у час прыбірання кватэры, аказваецца, што ў нас шмат непатрэбнага, напрыклад, стары чайнік, талеркі, пледы... Замест непатрэбшчыну выносіць на сметнік, перадайце лепшыя рэчы патрабуючым і гэта будзе наша святочнае валачобнае тым, якія сапраўды патрабуюць нашай дапамогі...

У Бельску: 730 20 06

• Маладое сужонства, без уласнай хаты, з невялікімі сродкамі на жыццё, патрабуе помачы ў выглядзе мэблі, халадзільніка і радыёпрыёмніка.

• Пяціасабовая сям'я просіць дапамогі ў выглядзе старой мэблі і адзення для дзяцей ва ўзросце 7, 9, 12 і 13 гадоў.

• Сям'я патрабуе пасцелі, цёплых ботаў для 5- і 13-гадовых хлопцаў і 7-гадовай дачкі.

• Сям'я патрабуе ботаў і лёгкіх світэраў, вясенніх куртак для 8- і 11-гадовых хлопцаў.

• Самотная маці з дума сынамі ва ўзросце 10 і 13 гадоў, якая пасля смерці мужа апынулася ў трагічным становішчы, прыме любую дапамогу дзеля стварэння нармальных умоў існавання, прыдасца старая мэбля, халадзільнік, тэлевізар.

• Сям'я без сродкаў для жыцця патрабуе адзення і абутку для дзяцей, а таксама пасцелі.

У Беластоку: 73 201 86, 712 11 53

• Сям'я патрабуе старой мэблі, халадзільніка, пасцелі.

• Сям'я патрабуе старой мэблі, халадзільніка і куртак для хлопцаў 14- і 16-гадовага ўзросту.

• Адзінокая маці, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 15-гадовай дзяўчынкі, а таксама пледаў і пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

• Аддам тапчан-полку з шафай, тэл. 651 80 20.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Вер — не вер...

Шаноўны Астроне! Такі смешны сон мне прысніўся, што проста не магу не напісаць табе і параіцца наконт таго, што б ён мог мне прадвяшчаць.

Дык вось. Я — жанчына, а сніцца мне, што я маю ляцець у космас. Ды, падумай ты толькі, палячу я не ў якасці пасажыркі, а як сапраўдная касманаўтка! Я гэты факт успрымаю з вялікім зацікаўленнем. І нават не магу сказаць, што апанаваў мяне страх! Хутчэй быў гэта непакой накшталт *Reisefieber* — гарачкі падарожжа.

Божа мой, у мяне ж столькі рэчаў (хаця я — не дома), што з імі зрабіць?! Узяць з сабою ці пакінуць невядома дзе... Каб жа я хаця была ў сваёй хаце! Дачка кажа, каб я надзела на пальцы два пярсцёнкі, якія знаходзіліся ў маіх рэчах. Я гляджу на іх, прымерваю на два пальцы. Прыгожа. Але дачцэ кажу: „Гэта ж табе не на шпацыр выйсці, а ў космас трэба ляцець. А там жа кожны грам вагі лічыцца. Навошта ж у ракеце будзе гэты баласт...”

Высветлілася, што ўсе мае клопаты, звязаныя з планаваным палётам у космас, былі непатрэбныя, паколькі палёт з маім удзелам адклікалі.

Мар'яна

Мар'яна, даражэнькая, што ж гэта табе такое наснілася?! Куды ж бабе ў космас! Вунь адна хацела ў Амерыку абавязкова з'ездзіць (і сказала баба дзеду: я ў Амерыку паеду), дык дзед яе абсмяяў. Ах ты, старая грамазда, туды ж ня ходзяць паязда, растлумачыў ён ёй. А ты — у ракету...

Ну, але, калі ўжо прыснілася, дык давай Астрон адказ. І я табе скажу, мая ты Мар'янка, што сон твой звязаны з нейкім нечаканым прыбыткам і пераменай на лепшае. Мо не ўсе твае спадзяванні споўняцца пры гэтым, зашмат будзе тут „нерваў” і крыху фальшу. Шкада, што ты ўсё ж не паляцела: тады напэўна б твае ўсе справы і пачуцці пайшлі як па масле.

Астрон

„Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

На Месяц заляцеў амерыканскі касмічны экіпаж. Яго камандзір з хваляваннем дакладвае свайму цэнтру на Зямлі:

— Ало! Рускі лунаход малюе Месяц на чырвоны колер. Што рабіць?

— Чакаць! — загадвае Зямля.

На другі дзень амерыканец зноў дакладвае:

— Лунаход памаляваў увесь бачны бок Месяца. Што нам рабіць?

— Пачакаць аж высахне, а пасля белай фарбай напісаць „Кока-кола”!

* * *

Гаспадыня да служанкі:

— Чаму ты не зняла з акна тае вялікае павуціны?

— Павуціны? Я была ўпэўнена, што гэта фіранка.

* * *

Вынаходнік прыйшоў да дырэктара гандлёвай фірмы:

— Купіце ў мяне прыладу, якая замяшчае дваццаць прадаўцоў!

— А мо ў вас ёсць прылада, — перапытвае дырэктар, — якая замесціць дзвесце пакупнікоў?

* * *

— Якая розніца між бландзінкай і каларадскім жукам?

— Каларадскі жук пустошыць бульбу, а бландзінка кішэні.

Стала ціха-ціха па ўсёй зямлі — па вадзе далёка крэйсеры плылі...

Мал. АЛЕГА КАРПОВІЧА

Музычныя навіны

У красавіку 2004 года адбудзецца „Рок-каранацыя”. Гэта фэст накшталт польскіх „Фрыдэрыкаў”. У гэтым годзе прызы прызнаваць будуць не толькі сябры журы, але ўсе жадаючыя. Галоўны націск арганізатары плануюць накіраваць на гурты з рэгіёнаў Беларусі. Мо і нашы падляшскія рок-фармацыі нешта заваююць.

Беларускія музыканты выступаюць усюды. **Самыя любімыя дзяржавы беларускіх гуртоў гэта Польшча, Расія, Нямеччына.** Арабскія краіны даволі часта знаходзяцца ў меню нашых рокераў і не толькі іх. Мінская блюз-каманда „Mojo Blues” вырашыла зрабіць адзін крок далей і паехаць у Кітай. Музыкі вярнуліся з самай „людной” дзяржавы задаволеныя і натхнёныя, з новым альбомам „Made in China”. Хто даў натхненне? Крыніцы не гавораць!

Ужо вядома, што XV **Фестываль Музыкі Маладой Беларусі „Басовішча 2004” адбудзецца ў днях 23-24 ліпеня 2004 г.** Як гаворыць прэзідэнт Беларускага аб'яднання студэнтаў — удзельнікаў чакае многа новых ды нечаканых якасцей. Падрабязнасці неўзабаве.

На хвалях Радыё Беласток **Юрка Асеннік — вакаліст гурту „Zero-85” паінфармаваў, што поўнафарматны альбом (першы) з'явіцца ўжо ўлетку.** Зараз гурт канцэртуе і рыхтуецца да працы ў студыі. Музыка „Zero-85” апошнім часам была выкарыстаная ў фільме „Osiemnaście”. Чакаем з вялікай нецярплівасцю!

Татка Стэп

Грамадзянская Беларусь

25 сакавіка 2004 г. у Беластоку адкрыецца выстава пад загалоўкам „Грамадзянская Беларусь”, прысвечаная беларускім няўрадавым арганізацыям. Мэта выставы — прэзентацыя сучаснай Беларусі, пытанняў і з'яў, якімі жыве беларускае грамадства, а таксама працэсу развіцця адкрытага грамадства, які праводзіўся цягам апошніх дзесяці гадоў. Штуршком для сарганізавання выставы быў працэс ліквідацыі няўрадавых арганізацый, які пачаўся ў 2003 г. Выстава паказвае дасягненні гэтых асяроддзяў, дзякуючы якім у Беларусі ствараецца грамадзянскае жыццё.

Арганізатары — Таварыства „Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр” і Брытанскае пасольства ў Варшаве — запрашаюць на адкрыццё выставы, якое адбудзецца ***25 сакавіка 2004 г. а гадз. 18⁰⁰ у будынку Універсітэта ў Беластоку, Універсітэцкая плошча, 1.***

Крыжаванка



1. дзяржава з Масквой, 2. прадукт працы выраблены для продажу ў... таварыша, 3. самец авечкі, 4. дзяржава з Пекінам.

(ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары ў пазначаных кропкай клетках.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 7 нумара:

Каюта, мятла, паляк, стыль.

Рашэнне: **Люты.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Ігнатовічу** і **Наталлі Каўшук** з Гайнаўкі.

28.03 – 3.04

Баран (21.03. — 19.04.) Вельмі творчы і дынамічны перыяд. Твая энергія і ініцыятыўнасць усіх задзівяць. Удасца табе рашыць вельмі складаную справу, якая ўжо даўно павінна быць афармлена. Будзь асцярожны на вуліцы.

Бык (20.04. — 20.05.) Ключ да поспеху — дыпламатыя і ўмеласць аб'ектыўнай ацэнкі фактаў. Калі плануеш большыя пакупкі, добра выбераш. Увесь сакавік у цябе — вельмі ўдалы, але не лянуйся.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Блізняты, народжаныя ў маі, будуць вельмі баявітымі, справяцца ўсюды, дзе трэба пільнаваць свайго. У любові паслухай інтуіцыі. Былыя праблемы могуць вярнуцца, калі не захаваеш асцярожнасці, і можаш папсаваць штосьці, што пасля цяжка будзе паправіць.

Рак (22.06. — 22.07.) Атрымаеш шанц рэалізацыі сваіх планаў, памогуць табе асобы са знакаў Дзевы, Рыб і Скарпіёна. Калі ты нарадзіўся паміж 25 і 30 чэрвеня, лёс падкіне табе вялікі выклік, з якім можаш паспяхова, хоць з цяжкасцямі, справіцца.

Леў (23.07. — 22.08.) Не дазваляй лёсу вырашаць за цябе. Нялёгка дагаворышся з блізкімі, а прычынай непаразуменняў могуць быць грошы. Мала асобы, якая параіла б табе штосьці канструктыўнае, але і ты сам добра ведаеш, чаго табе трэба. Адважся на шчырую размову з партнёрам. 28 сакавіка будзеш у ненайлепшай форме. Расчаруешся ў асобах, з якімі пазнаёміўся нядаўна, а якія дакларавалі сімпатыю.

Дзева (23.08. — 22.09.) Можаш разлічваць на праверaных сяброў. Чакае цябе змаганне з баявітымі працаўнікамі; будзь дыпламатычным. Смела падпісвай дамовы. Дзевы, народжаныя 5 — 8 верасня, могуць атруціцца ежай ці прастыць. Можаш адчуваць апетыт на высокакаларыйныя стравы — арганізм патрабуе дапоўніць тое, чаго яму не хапае.

Шалі (23. 09. — 23.10.) Захочаш стабілізацыі. Можа трапіцца любоў ад першага пагляду, і будзеш гатовы на ўсё. У пастаянных сувязях — штораз лепшае паразуменне. Калі варта паправіць адносіны — ідэальны час на гэта.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Твае пачуцці да партнёра разгарацца новым полымем. Шанц на паправу сітуацыі ў адносінах з людзьмі. Лічацца новыя ідэі, а ангажаванасць у працу адкрые перад табой новыя перспектывы. Вясна прынясе вялікія жарсці — твае інтымныя дачыненні сягнуць зеніту! Адпачывай штодзень хоць па паўгадзінкі!

Казярог (22.12. — 20.01.) Памогуць табе людзі, ад якіх гэтага не спадзяешся. Добрыя сувязі пяройдуць розныя завіраванні і ўзмоцняцца. Паправа сітуацыі на працы, можаш атрымаць магчымасць падзарабіць. Жанчыне паправяць настрой нейкая каштоўная штучка ці добрая парфума.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Захочаш узяцца за веснавыя парадкі. Так стомішся, што не будзеш чапляцца да сям'і. Скончыцца застой у інтарэсах. Еш менш, але здарова (збожжа, гародніну). Пазбягай сырасці і скразнякоў. 26 — 30 сакавіка асцярожна — будзеш нервавацца; пазбягай стрэсу і рызыкоўных сітуацый.

Рыбы (20.02. — 20.03.) 28 сакавіка не з усім справішся — найцяжэй будзе стрымаць нервы, шукай суцяшальных кліматаў у сяброў, кантакт з якімі будзе табе патоляй. Нейкае сяброўства можа ператварыцца ў раман; глядзі — могуць быць з гэтага праблемы!

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960